Тыднёвік Магілёўскі



№ 4 (68) 4 – 10 лютага 2000 г. Кошт 50 руб.

ЦІ ВЕДАМА ГРАМАДЗТВУ СЛОВА САЛІДАРНАСЬЦЬ



БОЛЬШ ЗА 100 ТЫСЯЧАЎ ЧАЛАВЕК У РОЗНЫХ МЕСЦАХ КРАІНЫ АБ'ЯДНАЛІСЯ Ў АКЦЫІ ПРАТЭСТУ

Першага лютага несумненна ўвойдзе ў найноўшую гісторыю Беларусі як дзень пачатку самай масавай непалітычнай акцыі. У той жа час адсутнасьць палітычных патрабаваньняў робіць прадпрымальніцкі страйк у вачах як улады, так і значнай часткі грамадзтва капрызам людзей, якія і так жывуць значна лепш за іншых. Ва ўсялякім выпадку на дзень пачатку прадпрымальніцкага страйку ў нашым абласным цэнтры ніхто з прадстаўнікоў улады не шукаў магчымасьці сустрэцца з тымі, хто кінуў працу – затое на іх адрас было выказана нямала кпінаў з боку гараджанаў, якія ў аўторак убачылі зачыненыя шапікі і адсутнасьць садавінагародніных латкоў уздоўж цэнтральнай вуліцы.

Магчыма, аднак, што мясцовае начальства апярэдзіў Лукашэнка, які, па некаторых зьвестках, аддаў загад старшыні Рады бясьпекі Шэйману знайсьці замену «гэтым чалнакам». Нагадаем, што такі мэтад спыненьня рабочага супраціву быў пасьпяхова ўжыты уладай падчас знакамітага страйку сталічных мэтрапалітэнаўцаў. Ці паўторыцца такое? Кіраўнікі прадпрымальніцкага выступу справядліва лічаць, што ўсё будзе залежыць ад салідарнасьці ў іхных шэрагах і ад салідарнасьці пакупнікоў, якія не павінны набываць тавары ў тых, хто здрадзіць наладжанай акцыі супраціву.

Пакуль такое адчуваньне, што на скаардынаваную акцыю прадпрымальнікаў улада ў сваю чаргу рыхтуе скаардынаваны адказ. Верагодна, што аб гэтым стане ведама сёньня, бо, па нашых зьвестках, на гэты дзень прызначаны агульны сход прадпрымальнікаў, на які пакажуць вочы прадстаўнікі мясцовай улады.

А распачаўся магілёўскі страйк прыватных гандляроў кароткім сходам актывістаў каля ДК швэйнікаў. Разам са старшынём мясцовай суполкі Свабоднага прафсаюза прадпрымальнікаў Сяргеем Фаміным яны канстатавалі, што страйк пачаўся зладжана і дружна. У абласным цэнтры не працавалі абодва прамысловыя кірмашы (стадыён і Задняпроўе), вялікая частка Цэнтральнага рынку, практычна ўсе шапікі, а таксама многія вулічныя прылаўкі па продажу гародніны і садавіны. Быў пацьверджаны намер трымацца да часу, пакуль улада не задаволіць патрабаваньні, што былі напярэдадні сфармуляваныя рэспубліканскім штабам акцыі пратэсту. Калі зьвесьці прэтэнзіі да аднаго сказу, іх можна было б пазначыць так: мы гатовыя працаваць па жорсткіх законах, аднак стабільных, зразумелых і справядлівых – працаваць ва ўмовах, якія сёньня стварае ўлада, немагчыма ні маральна, ні фізычна. Як зазначыў на сходзе адзін з прыватнікаў, сёньня сытуацыя нагадвае такую: калі б даішніку было дадзенае права на месцы растрэльваць тых, хто парушае правілы руху. Ня менш трапна і эмацыйна выказалася ягоная калега, жанчына сярэдняга веку: «Я хутка стану сталай пацыэнткай альбо нэўрапатоляга альбо наогул псыхіятра. Замест працы пачынаю дзень з думак аб тым, дзе і што я магла парушыць, якія санкцыі мяне могуць чакаць. Гэта ў той час, як я сумленна працую».

Акцыя прадпрымальніцкага пратэсту заяўленая як безтэрміновая, што, зразумела, малаверагодна. Аднак як меней месяц людзі настроены пратрымацца. Многае будзе залежыць, як адзначана вышэй, ад салідарнасьці: і прыватнікаў, і спажыўцоў. Ва ўлады, палітыкаў, журналістаў ды й проста грамадзянаў краіны зьявяецца падстава даведацца аб тым, ці ведама нашаму грамадзтву такое слова як салідарнасьць.

...На «Спартаку» ў першы дзень страйку, дарэчы, працавала 2 чалавекі. Спробы карэспандэнта разгаварыцца з кабетамі адсякаліся кароткімі, як дэвізы выказваньнямі: «Усё роўна нічога ня зьменіцца!», «Ад нас нічога не залежыць!». Пяць тысячаў прыватных прадпрымальнікаў Магілёву з аўторка думаюць інакш.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН, карэспандэнт «ТМ»

P.S. Як стала вядома рэдакцыі, у Менску на прадпрымальніцкім мітынгу пратэсту 31 студзеня па запатрабаваньні ўдзельнікаў у праект рэзалюцыі былі ўнесеныя два незапланаваныя папярэдне пункты: аб генацыдзе А.Лукашэнкі супраць уласнага народу й аб ягонай адстаўцы. Такім чынам можна канстатаваць, што сталічныя мітынгоўцы не ўтрымаліся ад высоўваньня палітычных патрабаваньняў.

РЭЙТЫНГ ПАДЗЕЯЎ ЗА СТУДЗЕНЬ ПАВОДЛЕ «ТМ»

Станоўчыя падзеі:

– Адмова эўрапейскіх парлямэнцкіх структураў пагадзіцца зь легітымнасьцю Нацыянальнага сходу Беларусі і працяг прызнаньня адзіным заканадаўчым органам краіны Вярхоўнага Савета XIII скліканьня, што выявілася падчас адбыўшыхся пасяджэньняў Эўрапарляманту і асамблеі АБСЭ.

* * *

– Скончаньне двухгадовага турэмнага ўтрыманьня Васіля Лявонава пад сьледствам (знаўцы сьцьвярджаюць, што адбываньне пакараньня ў зоне значна лягчэйшае за бясправнае знаходжаньне чалавека ў сьледчым ізалятары).

* * *

– Перамога Таварыства беларускай мовы над чынавенствам, што праявілася ў падтрымцы з боку Канстытуцыйнага суду законных патрабаваньняў ТБМ аб вяртаньні ўладных структураў да афіцыйнага ўжываньня ў працы і дакумэнтах беларускай мовы.

– Адмоўныя падзеі:

– Абмен Лукашэнкам і Пуціным Граматамі аб узаемнай ратыфікацыі дамовы аб утварэньні «саюзнай дзяржавы».

* * *

– Чарговы віток інфляцыі, што распачаўся напачатку месяца з нагоды рэзкага павышэньня цэнаў на прадукты харчаваньня, камунальныя паслугі і праязныя тарыфы.

БЛІЖЭЙШАЯ СУСТРЭЧА – 25 САКАВІКА

Днямі ў Варшаве прайшоў Сойм Хрысьціянска-Кансэрватыўнай партыі БНФ. Пасьля палітычнага дакладу лідэра Зянона Пазьняка была абмеркаваная бягучая сытуацыя ў краіне. Разам з тым сябры Сойму акрэсьлілі свае адносіны зь іншымі апазыцыйнымі партыямі і грамадзкімі рухамі.

Што тычыцца першага пытаньня, Сойм партыі пацьвердзіў свой няўдзел у любых выбарах, якія маюць адбыцца пад наглядам і па правілах цяперашняга беларускага рэжыму. Мэтай і першаснай задачай партыі застаецца барацьба за адхіленьне ад улады гэтага рэжыму.

Другой па важкасьці заявай ХК партыі БНФ сталася паведамленьне аб тым, што сябры партыі выключаюць свой удзел у акцыях, якія наладжваюцца іншымі апазыцыйнымі сіламі. Партыя З.Пазьняка лічыць, што большасьць гэтых акцыяў ня мае плёну і эфэкту з-за адсутнасьці акрэсьленых нацыянальна-адраджэнскіх мэтаў.

Бліжэйшай масавай акцыяй, якую будзе ладзіць КХП БНФ, стане адзначэньне Дня Волі 25 сакавіка – дзень абвешчаньня ў 1918 годзе Беларускай Народнай Рэспублікі.

Паводле інф. паведамленьня з Варшавы

МАРШ СВАБОДЫ-2 ПРОЙДЗЕ Ў ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ

Каардынацыйная рада дэмакратычных партый і арганізацыяў распачала падрыхтоўку да менскага Маршу Свабоды-2, які папярэдне прызначаны на 15 сакавіка – Дзень Канстытуцыі. Такім чынам (*у зьвязку з інфармацыяй з Варшавы*) становіцца відавочным, што асноўныя палітычныя сілы краіны больш ня маюць намеру яднаць свае намаганьні ў супрацьстаяньні рэжыму. Аднак далёка ня ўсе палітолягі, наглядальнікі і журналісты лічаць такую сытуацыю відавочна шкоднай. На паверхні выглядае, што сілы апазыцыі такім чынам паслабляюцца, аднак нямала меркаваньняў і на тую тэму, што самастойнасьць партыйных паводзінаў сьведчыць пра рэальную шматпартыйнасьць і сталасьць грамадзтва.

Пра гатовасьць прыняць удзел у Маршы Свабоды заявілі прадстаўнікі дэмакратычных арганізацыяў Літвы, Польшчы, Украіны, Расеі. Нагадаем, што менавіта замежная падтрымка падобных мерапрыемстваў асабліва раздражняе беларускі рэжым і ягоных расейскіх сябраў. Апошнім разам афіцыйны Менск не пашкадаваў нават дэпутатку Дзярждумы «яблычніцу» Вольгу Беклямішаву.

Паводле інф. паведамленьня зь Менску

РАДЫЁ СВАБОДА
BELARUS SERVICE RFE/RL

СЛОЎНІК СВАБОДЫ

Другі год Беларуская Служба радыё Свабода вядзе рубрыку «Слоўнік Свабоды. XX стагодзьдзе ў беларускай мове. Слова на дзень для памяці і для роздуму». «ТМ» вырашыў скарыстаць гэтыя матэрыялы ў друкаваным выглядзе з тым, каб дапамагчы нашым чытачам атаясамляць сябе й свае мары з нашай агульнай беларускай ПАМЯЦЬЦЮ І ГІСТОРЫЯЙ.

АМОН

Абрэвіятуры – справа нўдзячная і нясмачная. Ад пачатку году была ў нашых плянах абрэвіятура АМОН, і ніводны аўтар не пагадзіўся пра яе напісаць. «БНР» напісалі, нават «ЦК» напісалі, а вось «АМОН» – не.

Гэта відаць таму, што скарачэньне ня толькі чужое, а й ненавіснае. Атрад Міліцыі Особого Назначэнія, які мусіў бы выклікаць у народа пачуцьці абароненасьці, упэўненасьці і спакою, выклікае нешта наўпрост процілеглае.

Асацыятыўна АМОН зьвязаны са словамі манкурт, зомбі, дубінка, разгон, зачыстка, катаваньне, зьдзек.

Спробы перакласьці АМОН на беларускую мову як АМАП прыжыліся, але ненадоўга. Цяжка назваць такіх беларусаў беларускім скланданаскарочаным словам. Зь цяжкасьцю прымае нашая сьвядомасьць факт, што мы можам быць са сваім народам і такімі.

Рыба гніе з галавы. Вось жа АМОН і ёсьць у гэтай гнілой галавы – жабрамі, або шчэлепамі. Ён дае магчымасьць галаве дыхаць і лічыцца галавой.

Безаблічныя, схаваныя за шчытамі й маскамі АМОН усё ж складаецца з канкрэтных людзей. Як дзіўна, што ў іх ёсьць бацькі, каханыя і сябры. І як дзіўна, што ў некага ёсьць сын, каханы ці сябра – АМОНавец.

Мой сын – АМОНавец, мой каханы – АМОНавец. Гучыць зусім не па-беларуску. Паэта, які наважыцца шукаць да слова АМОН дакладнай рыфмы, найперш сутыкнецца ня толькі з сугучнымі, а й з цалкам адпаведнымі АМОНу словамі: шмон і гамон.

Сяржук СОКАЛАЎ-ВОЮШ

Камуфляж

Адметнаю своеасаблівасьцю слова зьяўляецца тое, што яно з іншамоўнага, ды яшчэ вузкаспэцыяльнага тэрміну-экзатызму – маскіроўка вайсковай тэхнікі – зь незвычайнай лёгкасьцю прыжылося на колішняй агульнасаюзнай, а цяпер вось і на нашай роднай беларускай глебе.

У тым і другім значэньні ў выніку зьменаў вонкавых і сутнасных, прататыпа чалавека з ружжом і колеру хакі зьмяніў чалавек з дубінкай і ў камуфляжы. І хоць яго можна сёньня сустрэць на кожным рагу гарадзкой вуліцы, ды цяжка з прычыны камуфляжу зразумець, каго ці што ён беражэ і які парадак ахоўвае. І паколькі яго камуфляжная ўніформа адзначаецца ў залежнасьці ад канфігурацыі і афарбоўкі плямаў па рознаму: дзень – ноч, лета – восень, мыш – салома, то застаецца гадаць, што гэта азначае – ці то канец сьвета, ці пачатак новага жыцьця, ці то яркі як летні дзень росквіт дэмакратыі, пры тым такой, якой, як мы ня раз чулі, няма ні ў воднай самай дэмакратычнай краіне, ці то яе імглісты вечар, ці прыцемак, ці то неабходнасьць [illegible] выжываньня накшталт мышына-лёўкі, ці то знак сядзець ціха пад мятлой як мыш хатняя.

Здачу нацыянальнай дзяржаўнасьці можна камуфляваць гучнымі словамі аб непарыўнай еднасьці і агульнасьці лёсу народаў; агрэсыўны імпэрскі панславізм – псэўдааргумэнтамі наконт адмысловай славянскай роднасьці; а рост узроўню інфляцыі і цэнаў – разлагольстваньнямі пра рост вытворчасьці ды павышэньне заробку і пэнсіяў.

«Камуфляваць» гучыць па-беларуску – [illegible].

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

АКТУАЛЬНАЕ АПЫТАНЬНЕ «ТМ»

ЯКІМ ВЫ БАЧЫЦЕ САЮЗ БЕЛАРУСІ З РАСЕЯЙ ПРАЗ ГОД?

Наш карэспандэнт на замову рэдакцыі правёў актуальнае апытаньне сярод супрацоўнікаў Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэта. Першае пытаньне ён задаў яшчэ на падыходзе да будынку наевучальнае ўстановы.

Мікалай Канстанцінавіч Кучарэнка *(прадае малако ля Магілёўскага Дзяржаўнага ўнівэрсытэта)*:

– Усё будзе добра. Мы з Расеяй – гэта адна сям'я. Так спакон веку было. П'яніцы сабраліся ў Белавескай пушчы, разагналі гасударства, цяпер ніяк не сабраць яго. Мы ня можам асобна, бо савецкая ўлада развучыла нас працаваць, мы ўмеем толькі піць, гуляць. І крадуць усё. У нас, у вёсцы Амхавая, у аднаго чалавека кабана ўкралі. Чалавек захварэў ад адчаю і праз два месяцы памёр. І колькі ў нас за год сьвіней пакралі, нікога не знайшлі... Што? Ці будзе ў саюзе інакш? Ня ведаю. Думаю, што горш ня будзе.

Выкладчыца катэдры агульнай фізыкі *(не назвала імя)*:

– Ня ведаю. Мне не да гэтага.

Ала Аркадзеўна, лябарантка:

– Мне страшна думаць пра гэты саюз. Я асабіста ад яго нічога не чакаю. А надзея?.. Французы кажуць: надзея як малако, калі яе доўга захоўваць, то яна пракісьне. У мяне ўжо няма і надзеі.

Мікалай Марозаў, загадчык катэдры матэматычнага аналізу:

– Пакуль я ніякага саюза ня бачу. Пачакаем, паглядзім, што будзе далей. Занава адбудаваць тое, што будавалася 50-70 гадоў, ужо немагчыма. А ці хочацца? Трэба глядзець не з таго, хочацца ці не. Трэба глядзець прагматычна: а што гэта дае? А я не бачу, што гэта можа даць. Можа я не адчуў гэтага разрыву таму, што мне не даводзіцца езьдзіць у Расею, у мяне там няма сваякоў. Але мае знаёмыя, якія езьдзяць, кажуць, напрыклад, што пасьля падпісаньня саюзнай дамовы бэнзын у Беларусі падаражэў больш рэзка, чымся ў Расеі. Перш, чым лезьці ў нейкі саюз, Беларусі трэба стаць нармальнай, надзейнай краінай. І калі мы такой краінай станем, то з намі любы сусед будзе ахвотнаісьці ў саюз. А то, як мне бачыцца, «несаюзная» Прыбалтыка будзе мець з Расеяй больш выгадныя стасункі, чым саюзная Беларусь. Бо прыбалтыйскія дзяржавы ўжо дасягнулі такога ўзроўню, што зь імі выгадна мець справу. І яшчэ. Паколькі ўжо быў нейкі досьвед саюзнага існаваньня, то новы варыянт можа атрымацца толькі падобным ранейшаму. Вунь і эўрапейскія краіны ствараюць саюз. Але ствараюць толькі тыя зь іх, у каго высокі ўзровень разьвіцьця і аднолькавыя эканамічныя парамэтры. У нас жа зусім ня так. І Беларусь, і Расея бедныя. І эканоміка ў нас разнародная. Расея ўжо амаль усё прыватызавала. А ў Беларусі пераважна дзяржаўная ўласнасьць. Які ж тут можа быць саюз?.. Прабачце за хаатычныя думкі.

Міхаіл Урбановіч, дацэнт:

– Пра саюз пакуль толькі адны размовы. І самі арганізатары яшчэ ня ведаюць, які будзе гэты саюз. Саюза яшчэ няма, ёсьць толькі намеры аб стварэньні саюза. І хто ведае, лепш там будзе ці горш.

Бібліятэкарка *(не назвала імя)*:

– Ніякіх добрых прагнозаў у мяне няма. Думаю, што нічога лепшага для нас ня будзе. Я ўжо ні ўва што ня веру.

Яраслаў Клімуць, дэкан:

– Я над гэтым пытаньнем ня думаў, але мяркую, што праз год гэтага саюза ўжо ня будзе. Ён разваліцца, бо мы з Расеяй ідзем у розныя бакі. У нас розныя падыходы ў эканоміцы. Саюз магчымы толькі ў адзінай форме: калі мы станем адной з расейскіх губэрніяў.

Сьвятлана, лябарантка:

– Шчыра кажучы, я вельмі баюся гэтага саюза. Я самога пагадненьня не чытала, але, як на мой розум, калі мы аб'яднаемся ў саюз, то ў нас з Расеяй будуць агульныя справы. Цяпер ідзе вайна ў Чачне. А ў мяне брат прызыўнога ўзросту і муж зьвязаны з ваеннай справай. Таму мне не хацелася б саюза.

Аляксандар Маргуноў, дацэнт:

– Гэты саюз як шлюб зайца з насарогам. Аб'яднаньне дзьвюх дзяржаваў у адну можа быць на глебе аднолькавага шляху разьвіцьця, на роўных эканамічных умовах і да таго падобнага. У нас жа эканамічныя базы, эканамічныя патэнцыялы вельмі розныя. Што з гэтай ідэі атрымаецца, пакажа гісторыя.

Супрацоўніца катэдры нямецкай філялёгіі *(не назвала імя)*:

– Я палітыкай не займаюся. Але жыць у такім саюзе я хачу. І вельмі хачу.

Наташа і дзьве Тацяны, супрацоўніцы катэдры ангельскай філялёгіі:

– Ніякіх зьменаў не чакаем. Магчыма, яны і будуць, але наўрад ці ў лепшы бок. Цяпер цяжка штось-небудзь сказаць.

Іна Жукава, выкладчыца:

– Я думаю, што за год нічога істотнага не адбудзецца, бо вельмі шмат дакумэнтаў трэба прыняць. Тут доўгая дарога.

Апытаньне правёў
М. БУЛАВАЦКІ

ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

... З КРЫЧАВА

На некаторых прадпрыемствах Крычава працаўнікоў прымушаюць набываць дабрачынныя квіткі, надрукаваныя Рускай праваслаўнай царквой. Грошы, сабраныя ад продажу квіткоў, пойдуць на патрэбы гэтай культавай установы. Кошт аднаго невялікі – ўсяго 100 рублёў. Але абурае іншае, а менавіта – прымусовасьць, зь якой робіцца гэтая справа. З гэтай нагоды ўзьнікае лягічная выснова, што Руская праваслаўная царква – гэта часткова ці нават цалкам... беларуская дзяржаўная ўстанова. Якая дбае не пра душы вернікаў, а пра нашыя з вамі 100 рублёў.

З-за недахопу кармоў у калгасе «Звязда» плянуецца да канца лютага здаць 700 галоў буйной рагатай жывёлы на мясакамбінат. Усяго ў гаспадарцы, якая спэцыялізуецца на жывёлагадоўлі, налічваецца 4000 галоў буйной рагатай жывёлы. Але замест таго, каб летась рабіць упор на вырошчваньне кармавых культураў, у калгасе па загадзе «зьверху» вырошчвалі лён і зерневыя.

... З МСЬЦІСЛАВА

Згодна інфармацыі раённага аддзела статыстыкі, дэмаграфічная сытуацыя ў раёне горшае. На працягу 1999 году памёрла 539 чалавек, а нарадзілася толькі 296. Дэмаграфічны мінус – 243 чалавека.

На пачатку года ў калгасах і саўгасах Мсьціслаўшчыны налічвалася 64 кормаўборачныя камбайны, зь іх толькі 20 былі спраўныя. Са 162 зерня ўборачных камбайнаў спраўнымі былі 35. Трактароў адпаведна – 807 (спраўных 545), грузавых аўтамабіляў – 380 (247), сеялак – 168 (87), культыватараў – 180 (101).

У параўнаньні з пачаткам 1999-га ў гаспадарках раёну статак буйной рагатай жывёлы зьменшыўся на 4804 галавы, альбо на 13%. Валавы надой малака склаў 23398 тон, што ў параўнаньні зь мінулым годам складае толькі 85%.

... З БАБРУЙСКУ

У студзені ў клюбе завода РТІ адбыўся рок-канцэрт, арганізаваны моладзевымі суполкамі – бабруйскай Грамадзянскага Форуму й магілёўскай «Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу». Падобнага канцэрту Бабруйск ня бачыў даўно: ён стаўся сапраўдным сьвятам. Спачатку на сцэну выйшла мясцовая група «Шлях», потым выступіла група «Флюгер», а напрыканцы грала «Новае Неба» з Касяй Камоцкай. Публіка сустракала гасьцей вельмі добра. У залю, разьлічаную на 300 месцаў, прыйшло нашмат больш прыхільнікаў беларускага року. Трэба адзначыць, што міліцыя не перашкаджала канцэрту й зусім не зьбіралася канфіскоўваць у прысутных нацыянальныя бел-чырвона-белыя сьцягі.

Напрыканцы мінулага месяцу ў ДК «Фандок» адбылася творчая вечарына пісьменьніка й гісторыка Уладзімера Арлова. Гэта было ўжо ня першым сумесным мерапрыемствам бабруйскіх арганізацыяў: Таварыства Філаматаў, Таварыства Беларускай Школы й Таварыства Беларускай Мовы, якія ладзяць сустрэчы гараджанаў зь вядомымі дзеячамі беларускай культуры. У Арлоў, напрыклад, ужо бываў у Бабруйску, аднак гэтым разам нават ён сам не спадзяваўся такога вялікага інтарэсу з боку жыхароў гораду на Бярэзіне. Вечарына працягвалася больш за тры гадзіны, а значную яе частку склалі адказы пісьменьніка на пытаньні прысутных. Таксама У. Арлоў прэзэнтаваў апошнюю кнігу, якую яны напісалі разам з Генадзем Сагановічам, – «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі».

... З ЧЭРЫКАВА

Дэмаграфічная сытуацыя ў раёне пагаршаецца з кожным годам. Пра гэта паведаміў раённы аддзел статыстыкі. За 1999 год на Чэрыкаўшчыне памёрла 348 чалавек, а нарадзілася 232. У 1993 годзе дэмаграфічны мінус складаў усяго 48 чалавек.

Пра цікавы выпадак расказала кіраўніца філіяла АСБ «Беларусьбанк» А. Івашкова. Аказваецца, самы стары банкаўскі ўклад на Чэрыкаўшчыне датуецца 1945 годам. Укладчыца, якая, дарэчы, яшчэ жывая, паклала на рахунак ашчадбанка ў далёкім «пераможным» годзе 4,5 тысячы рублёў. Тады на гэтыя грошы можна было набыць невялічкую хатку з лазьняй. Грошы захаваліся й іхная колькасьць нават павялічылася, за кошт працэнтаў, прыкладна ў тры разы. Вось толькі што можна за іх купіць зараз, бохан хлеба?

ПРОСТАЯ МОВА

«НА ЎЛАСНЫМ ВОПЫЦЕ»

«Сапраўдны лікбез на тэму «Як працаваць па-новаму» правёў М.У. Дражын, які сам доўгі час узначальваў сельскагаспадарчыя калектывы... Бясспрэчная ісціна: «Шчасьлівы той, хто можа сказаць – рабі, як я! – і пачуць у адказ – буду рабіць!». Вось гэты выраз, бадай, і раскрывае ўсю сутнасьць размовы, якая толькі што адбылася паміж круглянскімі гаспадарнікамі і старшынёй аблвыканкаму. Можна, вядома, было б узяць павышаны тон, запатрабаваць – усё ж улада. М.У. Дражын вырашыў па-свойму. Даходліва і пераканаўча, як калега калегам, ён расказаў аб праробленым некалі ім жа самім. А гэта, на мой погляд, усё ж некалькі больш даходліва».

З рэпартажу А. Паўлава
(Газэта «Сельскае жыццё» з Круглага, №7 за 29. 01. 00 г.)

БЕЛАПАН для «ТМ»

Былы кіраўнік аграпрамысловага аб'яднаньня «Рассвет» Васіль Старавойтаў прайшоў мэдыцынскі агляд у Літоўскай Рэспубліцы.

У гэтую краіну ён выехаў у канцы студзеня пры садзейнічаньні АБСЭ. 75-гадовы вэтэран вайны і працы быў абсьледаваны на кампутарным тамографе. Яму выпісалі неабходныя для лячэньня прэпараты. Курс лячэньня ён будзе праходзіць дома, у пасёлку Мышкавічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласьці. Урачы таксама прыйшлі да высновы аб неабходнасьці некалькіх хірургічных апэрацыяў. Узроўнем абсьледаваньня і яго вынікамі Васіль Старавойтаў застаўся задаволены, заўважыўшы, што пасьля двухгадовага турэмнага зьняволеньня і стрэсаў можна было чакаць і горшых наступстваў. На пытаньне аб магчымасьці падачы скаргі на прыгавор Кіраўскага раённага суда Васіль Старавойтаў сказаў, што ня верыць у аб'ектыўнасць разгляду скаргі і таму лічыць абскарджаньне прыгавора пустой тратай часу і сіл. Таксама коратка Васіль Старавойтаў пракамэнтаваў прысуд па справе былога міністра сельскай гаспадаркі і харчаваньня Васіля Лявонава. Паводле яго слоў, справы Старавойтава і Лявонава праведзены па аднаму плану. Мэтай было схаваць за гучнымі абвінавачваньнямі ў карупцыі правалы цяперашняй улады, яе некампетэнтнасьць. Гэтыя справы «зьбітыя» пасьпешліва і неаб'ектыўна. «Як ні шукалі, знайшлі толькі нейкія сталы і крэслы ды за іх буйнога кіраўніка схавалі за краты», – сказаў Старавойтаў.

•

31 студзеня ў нашай вобласьці поўнасьцю выплачана заработная плата работнікам бюджэтнай сфэры.

Пра гэта заявіў старшыня аблвыканкама Міхаіл Дражын. Але, ліквідаваўшы запазычанасьць, Магілёўшчына застаецца адзінай вобласьцю ў краіне, якая ніяк ня можа перайсьці на выплату зарплаты бюджэтнікам у два этапы. На думку кіраўніцтва аблвыканкама, да выплаты грошай двойчы ў месяц удасца перайсьці ў сакавіку. Ва ўсякім разе, такая задача пастаўлена перад раённымі і гарадзкімі выканаўчымі камітэтамі. Але эканамісты сьцьвярджаюць, што пры захаваньні цяперашняй дынамікі эканамічнага развіцьця гаварыць пра авансавыя выплаты дактарам і настаўнікам можна будзе хіба што ў траўні. Летась жа ў чацьвертым квартале рэальная зарплата работнікаў вобласьці, разьлічаная з улікам росту цэн на тавары і паслугі, паменшылася на 7,8 %. Самая нізкая заработная плата зарэгістравана ў сацыяльнай сфэры, на прадпрыемствах невытворчых відаў бытавога абслугоўваньня, у сельскай гаспадарцы, ва ўстановах культуры. Больш за іншых атрымлівалі работнікі трубаправоднага транспарту, банкаў, мікрабіялягічнай прамысловасьці і электраэнэргетыкі. Напрыклад, сярэдні заробак магілёўскага трубаправодчыка летась у 6 разоў перавышаў даход сацыяльнага работніка.

•

Летась у нашай вобласьці нязначна скарацілася колькасьць стратных прамысловых прадпрыемстваў.

Разам з тым, як сьцьвярджаюць дырэктары прадпрыемстваў, у першай палове 2000 года рэнтабельнасьць могуць згубіць нават стабільна працуючыя прамысловыя калектывы. Асноўнай прычынай стратнасьці магілёўскіх заводаў эканамісты называюць існаваньне старых валютных запазычанасьцяў. Напрыклад, эканамічны стан бабруйскага прадпрыемства «Фандок» не дазволіў яму своечасова разьлічыцца з крэдыторамі за валютную пазыку, узятую яшчэ у 1993 годзе на тэрмін у 3,5 гады. І зараз сума запазычанасьці складае 79 % сродкаў, атрыманых ад гадавой рэалізацыі прадукцыі. У сярэдзіне 1999 года да існуючых праблем прамыслоўцаў дадаліся новыя. Толькі з-за рэнтнага збору і пераацэнкі сыравіны, адно зь лепшых прадпрыемстваў вобласьці, завод «Магілёўтрансмаш», страціла каля 270 мільярдаў недэнамінаваных рублёў прыбытку. Зразумела, рэнтабельнасьць вытворчасьці машынабудаўнікоў летась істотна зьнізілася.

•

Спэцыялісты аддзяленьня гігіены працы Магілёўскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялёгіі адзначаюць, што праблемы аховы працы кіраўнікамі прамысловых прадпрыемстваў горада недаацэньваюцца.

Штогод на магілёўскіх прамысловых прадпрыемствах рэгіструецца ад 7 да 13 выпадкаў узьнікненьня прафэсійных захворваньняў, выкліканых шкоднымі ўмовамі працы. Летась, напрыклад, выяўлена 10 такіх фактаў. У прыватнасьці, 4 выпадкі прафэсійных захворваньняў зарэгістраваныя сярод работнікаў сталеліцейнага цэху Магілёўскага аўтазавода. Тры чалавекі захварэлі ў выніку шкодных умоў працы на магілёўскім вытворчым аб'яднаньні «Хімвалакно». Па адным факце прафэсійных захворваньняў выяўлена ў цэхах завода «Магілёўтрансмаш», «Магілёўліфтмаш» і Магілёўскім абласным супрацьтубэркулёзным дыспансэры. Спэцыялісты сьцьвярджаюць, што сёньня да разраду шкодных можна аднесьці пятую частку ўсіх рабочых месцаў на магілёўскіх заводах – узьдзеяньне небясьпечных для здароўя вытворчых фактараў там перавышае межавыя дапушчальныя нормы. Напрыклад, у сталеліцейным цэху аўтазавода канцэнтрацыя пылу, які ўтрымлівае крэмні, летась перавышала дапушчальныя межы ў 3-6 разоў. У большасьці выпадкаў, лічаць мэдыкі, ступень шкодных умоў на вытворчасьці можна было б зьнізіць, калі б кіраўнікі прадпрыемстваў больш увагі надалі мерапрыемствам па ахове працы.

•

31 студзеня ў працэсе па крымінальнай справе Міхаіла Чыгіра быў зноў абвешчаны перапынак – у сувязі з хваробай яго жонкі і абаронцы Юліі Чыгір.

Працэс па справе былога прэм'ер-міністра ідзе ў Менскім гарадскім судзе. Судзьдзя Аляксандар Васілевіч таксама задаволіў хадайніцтва аб дадатковым азнаямленьні з матэрыяламі 18-томнай крымінальнай справы, заяўленае грамадзкімі абаронцамі – намесьнікам старшыні Беларускага Хельсінскага камітэта Гары Паганяйлам і прадстаўніком праваабарончага камітэту «Вясна-96» Барысам Гюнтэрам. Задаволена і хадайніцтва дзяржаўнага абвінаваўцы аб выпатрабаваньні ў суд дадатковых дакумэнтаў – сьпісаў валютна-крэдытнай камісіі пры Савеце міністраў, а таксама часовага палажэньня Нацыянальнага банка аб парадку выдачы валютных крэдытаў. Абарона Міхаіла Чыгіра не падтрымала гэтыя хадайніцтвы. На яе думку, у 18-томнай справе павінны быць усе неабходныя дакумэнты, а калі іх няма, незразумела, на чым жа грунтавалася абвінаваўчае заключэньне. Міхаіл Чыгір, у дачыненьні да якога дзейнічае падпіска аб нявыезьдзе, зьвярнуўся з просьбай дазволіць яму кароткачасовы выезд у Маскву па асабістых матывах. Як вядома, экс-прэм'ер Беларусі пэўны час узначальваў у сталіцы Расеі прадстаўніцтва адной зь нямецкіх фірмаў. Аляксандр Васілевіч прапанаваў прадставіць гэтае хадайніцтва для разгляду ў пісьмовым выглядзе. Па-ранейшаму ў залю суду падчас паседжаньня не здолелі патрапіць усе жадаючыя. Міліцыя, якая ахоўвала будынак, тлумачыла, што месцы ў зале занятыя, а свабодныя зарэзерваваныя для прадстаўнікоў дыпламатычнага корпусу.

•

Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) 1 лютага заявіла рашучы пратэст у сувязі з грубымі парушэньнямі правоў журналістаў работнікамі міліцыі.

Так, 20 студзеня супрацоўнікі МУС не дапусьцілі ў залю паседжаньняў Менскага гарадзкога суду на адкрыты працэс па справе былога прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Чыгіра намесьніка рэдактара газэты «Свободные новости» Аляксандра Тамковіча, выдаўца газэты «Наша свабода» Паўла Жука, карэспандэнта радыё «Рацыя» Іну Студзінскую і іншых. Міліцыянты, якія адмовіліся прад'явіць службовыя пасьведчаньні, адцясьнілі журналістаў ад уваходу ў будынак суда і потым перашкаджалі іх працы. Усе спробы атрымаць нейкія тлумачэньні груба спыняліся. Падобная карціна паўтарылася і падчас наступнага судовага паседжаньня 31 студзеня. БАЖ лічыць, што сваімі дзеяньнямі работнікі міліцыі груба парушылі артыкул 114 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і артыкул 13 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, якія гарантуюць адкрытасьць і галоснасьць судовых працэсаў, а таксама артыкул 39 Закона аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі. Апошні, у прыватнасьці, прадастаўляе журналістам права свабодна зьбіраць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю, а таксама прысутнічаць на месцы грамадзка значных падзей і перадаваць інфармацыю адтуль. БАЖ патрабуе ад кіраўніцтва МУС і ГУУС Менгарвыканкама правесьці службовае расьсьледаваньне па фактах дэманстратыўных парушэньняў работнікамі міліцыі правоў журналістаў.

БЕЛАПАН для «ТМ»

ІШОЎ ЧАЛАВЕК ЗА ГОДНАСЬЦЬ І МОВУ

Мінулай пятніцай а сярэдзіне дня некаторыя з магілёўцаў сталіся сьведкамі цікавай карціны: уздоўж цэнтральнае вуліцы горада, ад чыгуначнага вакзала да драмтэатра, ад плошчы Арджанікідзэ па вуліцы Чалюскінцаў да ДК завода штучнага валакна ішоў чалавек.

Аднак чалавек ня проста ішоў – ён уяўляў сабою пратэст. Бо навошта тады плякаты, якія ён нёс на сабе. Надвор'е было не зусім спрыяльнае: некалькі разоў спрабаваў сыпаць сьнег, вецер шкуматаў плякаты. А чалавек нетаропка ішоў...

Якая ж праблема сталася падставай такога ўчынку? Што змусіла чалавека да дзеяньняў, якія сёньня народу падаюцца небясьпечнымі? Хто гэты чалавек?



Ваш карэспандэнт меў магчымасьць суправаджаць гэтае «шэсьце» цягам усяго маршруту. Пазьней ён задаў арганізатару колькі пытаньняў. Знаёмцеся: Міхась Пятровіч Булавацкі, былы настаўнік матэматыкі з трыццацігадовым стажам выкладчыцкай дзейнасьці. Яшчэ ня так даўно ён чынна выкладаў мэтодыку матэматыкі ў Магілёўскім пэдагагічным інстытуце, дзе займаўся гэтым 19 год. На сёньня ён 19 месяцаў бяз працы.

– Міхась Пятровіч, скажыце, калі ласка, што сталася чыньнікам выхаду на вуліцу? Вашае беспрацоўе ці штось іншае?

– Так, маё беспрацоўе было адным з чыньнікаў, аднак не галоўным. Найперш я зрабіў гэта дзеля «выцісканьня зь сябе раба». Я даволі працяглы час удзельнічаю ў палітычнай, грамадзкай дзейнасьці. Аднак ніколі не карыстаў адкрытай формы пратэсту аднаасобна. Я ня ведаў, якой будзе рэакцыя ўлады, людзей. Перадгісторыя гэткага кроку даволі доўгая. Справа ў тым, што я ня маю магчымасьці выкладаць матэматыку ў беларускай клясе. Хутка будзе два гады, як я спрабую дамагчыся ад гарадзкіх уладаў нармальнага дыялёгу. Гаворка ідзе пра беларускую клясу, хаця б адну на горад. Я знайшоў настаўнікаў, якія згадзіліся працаваць у такой клясе, ёсьць бацькі, якія жадаюць каб іх дзеці навучаліся ў беларускай мове. Аднак улады не жадаюць нічога мяняць. На сёньня ў Магілёве існуюць некалькі беларускіх клясаў, але фармалёва, бо шмат прадметаў выкладаюцца ў расейскай мове. Я спрабаваў пераканаць улады ў неабходнасьці адкрыцьця хаця б аднае беларускае клясы. Але ж са мною не жадаюць весьці размову па сутнасьці, а на ўсе мае звароты адказваюць, што няма вакансіяў.

– Мажліва, што й праўда няма тых вакансіяў?

– Справа ў тым, што я не пра вакансіі пытаўся. Я хацеў атрымаць адказ адносна мажлівасьці стварэньня беларускае клясы – адзінай – у горадзе. А для гэтага патрабуецца памяшканьне. Калі ўлады ня маюць мажлівасьці яго прадаставіць – гэта ня ёсьць перашкодаю. Я знайшоў прыстойнае месца. Калі ўлады ня маюць на тое сродкаў – я ўпэўнены, што іх знайду. Таму мой «выхад у горад» быў абумоўлены жаданьнем надаць прабламе грамадзкі рэзананс і прымусіць уладу пачаць дыялёг.

– Як Вам падаецца ці дасягнута мэта?

– Грамадзкі рэзананс ёсьць, бо ўчора пасьля рэпартажаў, якія былі на тэлевізіі й радыё, некалькі чалавек пыталі ў мяне пра вынікі й намеры адносна працягу. Уладзе будзе ня проста адфутбольваць мае звароты. Мяркую, што артыкулы ў газэтах таксама паспрыяюць таму. А сам я пляную ўдасканальваць тактыку сваіх дзеяньняў.

– Можна так разумець, што вашае шэсьце было крокам адчаю?

– Не, хоць і можа так падацца. Гэта была праверка, пошук формы пратэсту, бо я разумею, што адзінкавым «паходам» праблему не вырашыць.

Трэба дадаць, што Міхась Пятровіч зьвяртаўся па дазвол на шэсьце па зусім іншым маршруце. Ён плянаваў пачаць рух ад інтэрната інстытута, дзе жыве, па вуліцы Ленінскай і да Дома Саветаў. Бо яшчэ меўся перадаць пэтыцыю пратэсту гарадзкім уладам. Аднак чыноўнікі не пажадалі сустракацца зь ім. Бо паводле рашэньня, якое падпісаў намесьнік гарадзкога галавы сп. Мельнікаў, шэсьце было дазволена на адрэзку ў 100-150 мэтраў уздоўж вуліцы Чалюскінцаў: ад перакрыжаваньня з вуліцай Раманава да ДК ЗШВ. Менавіта там і мусіў гуляць дзьве гадзіны былы выкладчык. Што тычыцца пэтыцыі, дык Міхась Пятровіч хацеў перадаць яе дырэктару ДК. Але дырэктар не абяцаў, што перадасьць пэтыцыю па прызначэньні.

Валадар ЦУРПАНАЎ

Ад рэдакцыі. *«Тыднёвік Магілёўскі» гэтым артыкулам зьвяртаецца да старшыні Магілёўскага гарвыканкама з запытам: калі будзе адчынена беларуская кляса? Ня ёсьць ашчадным, калі ведамы, нават за межамі краіны, высокапрафэсійны выкладчык ня мае мажлівасьці працаваць па прафэсіі. Ён патрабуе ад вас прыняць рашэньне аб адкрыцьці адзінае беларускае клясы, не фармалёва, а насамрэч беларускай. Мы чакаем адказу.*

Праграма тэлебачаньня з 7 лютага па 13 лютага

•• Понедельник, 7 февраля ••

Праграму тэлеканалаў мы друкуем на замову чытачоў. Гаспадары праграмы падаюць нам яе на расейскай. Рэдакцыя фізычна (па часе) не пасьпявае яе перакласьці. Просім разглядаць гэтыя старонкі як тэхнічна-службовы матэрыял, які ня мае дачыненьня да зьместу й характару нашай газэты.

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.10 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 "Сегодня с вами..."
9.50 Мультфильм.
10.10 "На волне взаимопонимания".
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.55 Мультфильмы.
12.10 Теленавигатор.
12.30 Музыкальный салон. "Покидая навсегда..." Часть 1-я.
13.15 Л.Лужина и В.Высоцкий в худ. фильме "Вертикаль".
14.30 Бездельник.
15.10 "Все любят цирк".
15.49 Видеокурс немецкого языка.
16.19 ТВ — школе.
16.40 Авто-парк.
16.50 Премьера песни.
17.10 "А музыка звучит..." Поет Ирина Дорофеева.
17.30 Туробъектив.
17.50 "Сегодня в нашем доме праздник". Минскому областному центру народного творчества — 60 лет.
18.25 "Понедельник с "Христофором".
18.40 Спортивные новости.
19.20 Политические диалоги.
19.50 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Киноповесть "Мой друг Иван Лапшин".
23.35 Криминальная хроника.
23.40 Третий тайм.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.20 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 Пока все дома.
9.45 Конькобежный спорт. Чемпионат мира. Многоборье. Передача из США.
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 "Охотники за привидениями".
14.45 Что да как.
15.00 Звездный час.
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд". Сериал.
17.25 "С легким паром!"
17.55 Мы и время.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Сериал "Секретные материалы".
22.40 "Взгляд".
23.35 "Майк Хаммер: Убийство на память".

"РОССИЯ"

15.30 "Секретные агенты". Мультсериал.
16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Сиреневый туман.
20.45 Мелодрама "Умереть, чтобы жить".
23.15 "Спорт+ТВ".
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".
0.20 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Она написала убийство".
8.50 Мультфильм.
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Вчера в "Итогах".
10.45 Куклы.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Короли и капуста". Заключительная часть.
13.30 "Чистосердечное признание".
13.55 "Улицы разбитых фонарей - II". "Визит к доктору".
15.35 Сериал "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
15.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 "Скорая помощь".
19.55 Совершенно секретно.
21.45 Двое.
22.30 "Итого".
22.55 Сегодничко.
23.35 Сегодня в полночь.
23.55 "Антропология".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя". Телесериал.
11.30, 13.00 Новости культуры.
11.40 "Три". Худ. фильм.
12.56 Анонсы.
13.00 "С потолка". Эткинд. Передача 1-я.
13.45 Шедевры мирового музыкального театра. "Лондонская фестивальная труппа".
15.00 Новости.
15.10 "Жил-был хомяк".
15.35 Времена и воины. "Римские легионы".
16.00 Вариации на тему классики.

"МОГИЛЕВ-1" НА БТ

13.15 Пунктир.
13.45 Телелоцман.
14.05 Мультфильмы.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 Астро-дайджест.
8.05 "Искушение". Телесериал.
8.50 "Путешественники во времени". Док. сериал.
9.15 "Гуляют,болтают". Комедия.
16.30 "Диагноз:убийство". Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 "Природа Австралии". Док.сериал.
18.00 "Праздник в Вашем доме".
19.00 Тяжелый день.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Воскресный папа". Худ. фильм.
22.05 Астро-дайджест.
22.15 "По данным уголовного розыска". Детектив.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.06—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Городские новости.
18.45 "Пляж".
19.28 Прогноз погоды.
19.30 "Поздравления".
20.15 "В гостях у бабки Агапки".
20.30 "Поздравления".
21.20 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
21.45 "Роботы". Худ. фильм.
23.15 Спортивная программа.

•• Вторник, 8 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.45 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.30 Мультфильм.
15.10 Мультфильм.
15.30 Видеокурс итальянского языка.
16.00 Видеокурс английского языка.
16.25 ТВ — школе.
17.13 "Все кого-то любят". Короткометражный худ. фильм.
18.00 Потребительская корзина.
18.15 Здоровье.
18.40 Спортивные новости.
19.20 "Сегодня с вами..."
19.50 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Остросюжетная драма "Палач".
23.40 Криминальная хроника.

ОРТ

13.30 Программа "Вместе".
14.00, 17.00, 23.10 Новости.
14.20 "Охотники за привидениями".
14.45 Возможно все!.
15.00 Программа "Царь горы".
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 Планета КВН.
17.55 Ищу тебя.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Г. Вицин и Л. Куравлев в комедии "Опасно для жизни!"
22.40 "Помню...Люблю..." Сигизмунд Кац.

"РОССИЯ"

8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
8.20 Гомеопатия и здоровье.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Гомеопатия и здоровье.
9.10 "Цыганка".
9.55 "Лето нашей тайны".
10.50 "Первая зима". Мультфильм.
15.30 "Секретные агенты".
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Полный модерн.
20.45 Ш. Маклэйн, Ф. Синатра и Д. Иан в комедии "В погоне за миллионом".
22.45 М. Швейцер в программе "Персона".
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".
0.20 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 Совершенно секретно.
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Герой дня без галстука.
9.55 "Третий тайм".
10.45 Мультфильм.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Транзит". Часть 1-я.
13.30 А. Неволина и Ф. Янковский в фильме "Сентиментальное путешествие на картошку".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.35 Герой дня.
18.55 "Скорая помощь".
19.45 Боевик "Агент национальной безопасности. Наследник".
21.45 "Глас народа".
23.05 "Сегодничко".
23.45 Сегодня в полночь.
0.05 "Антропология".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя".
11.30, 13.00 Новости культуры.
11.40 "Скоро будет конец света". Худ. фильм.
13.00 Рассказы старого сплетника. "Неизвестная роль... Евгения Евстигнеева".
13.45 "Приключения Буратино". Мультфильм.
15.00 Новости.
15.10 "Жил-был хомяк".
15.35 Времена и воины. "Воины на слонах".
16.05 Ортодокс.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 "Навіны раніцы".
8.05 "Искушение". Телесериал.
8.50 "Сверхнаука". Док.сериал.
9.15 "Воскресный папа". Худ.фильм.
16.30 "Диагноз:убийство". Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 "Мудрость древних". Док.сериал.
17.55 "Праздник в Вашем доме".
18.30 Катастрофы.
19.00 Бобруйский вариант.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Украсть и убежать". Комедия.
22.10 Астро-дайджест.
22.20 "Девушка на мосту". Драма.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.08—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Мультфильм.
18.40 "Пляж".
19.23, 20.58 Прогноз погоды.
19.25 "Поздравления".
21.00 "Супертайфун". Док. фильм.
21.25 Высокая мода.
21.35 Сюрреалистическая драма "Нога".
23.05 Спортивная программа.

•• Среда, 9 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.45 Новости.
8.15 "Сегодня с вами..."
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Видеокурс итальянского языка.
10.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.10 "Кофе с ароматом женщины".
11.50 Компьютерный полигон.
12.10 Око.
12.30 Зорная ростань.
13.15 Видимо-невидимо.
14.25 Ток-шоу "Карамболь" с участием Виталия Вульфа.
15.10 "Все любят цирк".
15.40 Видеокурс немецкого языка.
16.10 "5 x 5".
16.40 ТВ — школе.
17.10 "Придвинские забавы". Фильм-концерт.
17.30 "Макаенка,9".
18.00 "Есть только миг..." Телеочерк.
18.40 Спортивные новости.
19.15 "Сегодня с вами..."
19.40 Лотерея "Толока".
19.55 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Н.Олялин в худ.фильме "Мировой парень".
23.10 Криминальная хроника.
23.15 Королевская охота.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 Планета КВН.
9.45 Ищу тебя.
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 "Охотники за привидениями".
14.45 Классная компания.
15.00 Зов джунглей.
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 Маски-шоу.
17.55 Человек и закон.
18.50 "Девушки с характером".
19.15 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Романтическая комедия "Ее алиби".
22.40 Программа "Цивилизация".

"РОССИЯ"

6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
7.15 Телеспецназ: "Дежурная часть".
8.20 Квантовая медицина.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Квантовая медицина.
9.10 "Цыганка".
10.00 "Лето нашей тайны".
10.50 "Крот и зонтик". Мультфильм.
15.30 Мультфильмы.
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Сам себе режиссер.
20.45 Б. Токарев в политической драме "Президент и его женщина".
22.30 "Мода + ТВ". Тележурнал.
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".
0.20 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 Боевик "Агент национальной безопасности. Наследник".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 "Глас народа".
10.45 "Среда".
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Транзит".
13.25 М. Кристалинская, Л. Зыкина, М. Магомаев и Э. Пьеха в музыкальном фильме "Когда песня не кончается".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.35 Герой дня.
18.55 "Скорая помощь".
19.45 "Агент национальной безопасности. Медуза Горгона".
21.45 Независимое расследование.
22.35 Сегодничко.
23.25 Сегодня в полночь.
23.45 "Антропология".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя".
11.30, 13.00 Новости культуры.
11.40 "Мастер и Маргарита". Худ. фильм.
13.15 "Дворцовые тайны". Монплезир.
13.45 "Двенадцать месяцев". Мультфильм.
14.45 Куда редко заходит солнце.
15.00 Новости.
15.10 "Жил-был хомяк".
15.35 Времена и воины. "Гунны".
16.05 В.Родзянко. "Судные дни". Фильм 3-й.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.25 Бобруйский вариант.
14.45 Мультфильмы.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 "Навіны раніцы".
8.05 "Искушение". Телесериал.
8.55 "Вольные сердца". Док.сериал.
9.20 "Украсть и убежать". Комедия.
16.30 "Диагноз:убийство". Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 "Железный фактор". Тележурнал.
18.00 "Праздник в Вашем доме".
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Зигзаг". Боевик.
22.15 Астро-дайджест.
22.25 Спорт планеты.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.08—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Городские новости.
18.45 "Пляж".
19.28 Прогноз погоды.
19.30 "Поздравления".
20.15 "В гостях у бабки Агапки".
20.30 "Поздравления".
21.20 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
21.45 Криминальная драма "Юная узница".
23.00 Спортивная программа.

•• Четверг, 10 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.10 Новости.
8.15 "Сегодня с вами..."
8.40 Потребительская корзина.
9.15 Королевская охота.
9.45 Мультиклуб.
10.00 "Вас вызывает Спортландия".
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.55 "Александровский парк". Киноочерк.
12.05 Наш край. "Из истории г.Гродно".
12.30 "А музыка звучит..."
13.15 "Земляки". Государственное предприятие "Гранит".
14.15 Телевизионный Дом кино. Лучшие актеры 1999 года.
15.10 Видеокурс итальянского языка.
15.40 Видеокурс английского языка.
16.05 ТВ — школе.
16.35 "Корреспондент-148". Телеочерк о разведчике Михаиле Бабаевском.
17.10 "Ирина Отиева". Фильм-концерт.
17.30 Усадьба.
18.00 "На волне взаимопонимания".
18.40 Спортивные новости.
19.20 Политические диалоги.
19.50 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Последняя дорога". Худ.фильм.
23.35 Криминальная хроника.
23.40 "Крок-2".

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.00 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 Маски-шоу.
9.45 Человек и закон .

10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 "Охотники за привидениями".
14.45 Семь бед — один ответ.
15.00 Программа "100%".
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 "Каламбур".
17.55 Процесс.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 И. Розанова и В. Грамматиков в музыкальной комедии "Привет от Чарли-трубача".
22.30 Премьера программы "Посмотри".

"РОССИЯ"

6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
7.15 Телеспецназ: "Дежурная часть".
8.20 Гомеопатия и здоровье.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Гомеопатия и здоровье.
9.10 "Цыганка".
9.55 "Коварный обольститель" (Индия). Худ. фильм. 1-я серия.
15.30 Мультфильмы.
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Клуб "Белый попугай".
20.45 М. Булгакова и В. Шалевич в мелодраме "Прощение".
22.30 "Мода + ТВ".
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".
0.20 Горячая десятка.
1.15 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Агент национальной безопасности. Медуза Горгона".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Независимое расследование.
10.15 Большие родители.
10.45 Мультфильм.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Транзит".
13.35 А. Хвыля, Л. Хитяева, С. Мартинсон и Г. Милляр в фильме "Вечера на хуторе близ Диканьки".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.35 Герой дня.
18.55 "Скорая помощь".
19.45 "Агент национальной безопасности. Шантаж".
21.45 "Женский взгляд".
22.20 Сегоднячко.
23.10 Сегодня в полночь.
23.30 Брук Адамс в фильме "Отец Джон".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя".
11.30, 13.00 Новости культуры.
11.40 "Человек — не птица". Худ. фильм.
12.55 "Кто там..."
13.45 Мультфильмы.
14.05 Царская ложа.
14.45 Легенды театра. В.И.Качалов.
15.00 Новости.
15.10 "Жил-был хомяк".
15.35 Времена и воины. "Кельты".
16.10 В.Родзянко. "Первая любовь". Фильм 4-й.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.15 "Рандеву со звездой".Игорь Крутой.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 "Навіны раніцы".
8.05 "Искушение".Телесериал.
8.45 "Вольные сердца".Док.сериал.
9.10 "Зигзаг".Боевик.
16.30 "Из жизни женщин".
17.00 Ток-шоу "Я сама"."Я не жалею ни о чем".
17.55 "Праздник в Вашем доме".
18.45 Мультфильмы.
19.00 "Откровенно..."
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Одиночки".Комедия.
22.20 Астро-дайджест.
22.30 "Белые телефоны".Комедия.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.08—11.00 ТВ-6.
11.00 "Музыкальная коллекция".
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 "Шанс".
18.45 "Пляж".
19.25 "Поздравления".
20.58 Прогноз погоды.
21.00 "Путешественники во времени". Док. фильм.
21.25 Высокая мода.
21.30 "Шанс".
21.45 Триллер "В целях безопасности государства".
23.25 Спортивная программа.

•• Пятница, 11 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Видеокурс итальянского языка.
10.10 "Буковка".
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.55 Сделано в Беларуси. ПО "Минскоблнефтепродукт".
12.10 Усадьба.
12.35 "Забытые небеса". Док.фильм.
13.12 Лирическая комедия для детей "Магия черная и белая".
14.25 Бон тон.
15.10 "Все любят цирк".
15.40 Окружающая среда.
16.05 Регион. Передача из Могилева.
16.30 "Риск-версия". Телеигра.
17.10 "А музыка звучит..."
17.30 Наш край. "Из истории г.Гродно".
17.55 Документальный экран. "Соло для трубы".
18.40 Спортивные новости.
19.20 "Сегодня с вами..."
19.50 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 О.Меньшиков в лирической комедии "Покровские ворота". 1-я и 2-я серии.
0.20 Криминальная хроника.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 "Каламбур".
9.45 Процесс.
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 Приключенческий фильм "Прерия".
16.00 "Нежный яд".
17.25 Джентльмен-шоу.
18.00 Документальный детектив. "Черная метка" Сильвестра. Дело 1998 года".
18.30 Вкусные истории.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Коломбо в детективе "Кризис личности".
22.30 "Эх, Семеновна!"
23.25 Рутгер Хауэр в триллере "Страна отцов".

"РОССИЯ"

6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
7.15 Телеспецназ: "Дежурная часть".
7.35 Тысяча и один день.
8.20 Квантовая медицина.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Квантовая медицина.
9.10 "Цыганка".
10.00 "Коварный обольститель". Худ. фильм. 2-я серия.
15.25 Диалоги о рыбалке.
16.20 Акуна матата.
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 Агата Кристи. Пуаро. "Ограбление в миллион долларов".
19.25 "Городок".
20.45 Сергей Бодров (младший) и Вячеслав Бутусов в фильме "Брат".
22.35 "Панорама недели". Painterжурнал.
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".
0.20 Магазин на диване.

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Агент национальной безопасности. Шантаж".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 Без рецепта.
10.00 Дог-шоу "Я и моя собака".
10.30 Служба спасения.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Транзит". Заключительная часть.
13.35 Л. Неведомский, А. Соловьев и А. Хочинский в детективе "По данным уголовного розыска..."
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 Впрок.
16.40 Интересное кино.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 "Крутой Уокер: правосудие по-техасски".
19.50 "Агент национальной безопасности. Транзит". Заключительная серия.
21.45 "Криминальная Россия". "Сибирский потрошитель". 2-я серия.
22.15 Чарльз Гродин в комедии "Ожог".

"КУЛЬТУРА"

10.35 "И огонь, и пламя".
11.30, 13.00 Новости культуры.
11.40 "Невинность без защиты". Худ. фильм.
13.45 "Конек-Горбунок". Мультфильм.
15.00 Новости.
15.10 Кино — детям. "Жил-был хомяк".
15.35 Времена и воины. "Викинги".
16.00 В.Родзянко. "Миротворец". Фильм 5-й.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.25 "Откровенно..."
14.45 Мультфильмы.
16.04 Регион.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30,7.10 "Ранехонько!"
7.00 "Навіны раніцы".
8.05 "Искушение".Телесериал.
8.50 "Мир природы".Док.сериал.
9.15 "Одиночки".Комедия.
16.30 "Из жизни женщин".
17.00 "Незримое вторжение".Телесериал.
17.45 Мультфильмы.
18.00 "Праздник в Вашем доме".
19.20 Телемагазин.
19.30 Пунктир.
20.10 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Черная сутана".Приключения.
22.25 Астро-дайджест.
22.35 Рейтинг-фильм.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
9.08—12.00 ТВ-6.
15.00 ТВС представляет.
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Городские новости.
18.45 "Пляж".
19.28 Прогноз погоды.
19.30 "Поздравления".
20.15 "В гостях у бабки Агапки".
20.30 "Поздравления".
21.20 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
21.45 Боевик "Болт".
23.15 Музыкальная коллекция.

•• Суббота, 12 февраля ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 "Первая муза Несвижа". Док. фильм.
8.10 Столица.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00, 19.00 Новости.
9.10 Мультфильм.
9.30 Книгосбор.
10.00 Здоровье.
10.25 Вершина мира.
10.50 Компьютерный полигон.
11.15 "Все нормально, мама!"
11.45 Спортивные новости.
12.00 Усадьба.
12.25 Худ.фильм "Таинственный остров".
13.55 Сущность.
14.20 Олимп.
15.13 Познай себя.
15.38 Мультфильм.
15.55 "Все мы родом из детства".
16.50 "Финский экзамен". Итоги отборочного турнира чемпионата мира по мини-футболу.
17.15 Худ.фильм "Комедиант".
19.15 Из достоверных источников.
19.35 Бездельник.
20.00 Телебарометр.
20.15 "Кофе с ароматом женщины".
21.00 Панорама.
21.40 Детективная история "Уик-энд за миллион".
22.55 Видимо-невидимо.

ОРТ

7.00, 9.00, 14.00, 17.00 Новости.
7.10 Слово пастыря.
7.25 "Все путешествия команды Кусто".
8.15 Веселые истории в журнале "Ералаш".
8.25 Играй, гармонь любимая!
9.10 Смак.
9.30 Поле чудес.
10.30 Утренняя почта.
11.00 В. Зельдин и Г. Бурков в фильме "Добряки".
12.50 В мире животных.
13.30 История одного шедевра. Русский музей.
14.10 Тема.
14.55 Новая программа ОРТ "Седьмое чувство".
15.40 Ирина Купченко в авторской программе Э.Рязанова "Бабье лето".
16.20 "Детектив-шоу".
17.10 "Ералаш".
17.30 Угадайка.
18.10 Том Хэнкс в комедии "Тернер и Хуч".
20.00 Авторская программа С. Доренко.
21.20 "Китайский городовой".
22.10 Песня года.
23.00 Клинт Иствуд в боевике "Внезапный удар".

"РОССИЯ"

7.00 Мультфильм.
7.10 "Золотые часы". Худ. фильм для детей.
8.30 Почта РТР.
9.00 Доброе утро, страна.
9.35 "Сто к одному". Телеигра.
10.25 Сам себе режиссер.
10.55 "Друзья". Комедийный телесериал.
11.25 Эх, дороги...
11.40 "Золотой ключ".
12.00, 20.00 Вести.
12.20 Федерация.
13.00 Е. Драпеко, Л. Прыгунов и Л. Куравлев в мелодраме "Безотцовщина".
14.35 "Том и Джерри".
15.05 Телеспецназ.
16.05 "На здоровье!" Ток-шоу.
17.00 Моя семья.
18.00 "Два рояля".
18.55 "Аншлаг" и К°.
20.45 И. Бочкин, В. Раков и Л. Удовиченко в авантюрной трагикомедии "Барханов и его телохранитель".
23.00 Триллер "Карнозавр".

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
7.15 "Агент национальной безопасности. Транзит". Заключительная серия.
8.00 "Закон джунглей".
8.35 "Миго — инопланетянин".
9.15 "Чистосердечное признание".
9.45 Круглая дата. Лидия Смирнова.
10.15 Без рецепта.
10.45 Фитиль.
11.25 Большие деньги.
11.55 Л. Лужина и В. Тихонов в фильме "На семи ветрах".
13.45 "В нашу гавань заходили корабли".
15.25 "Любовные истории, которые потрясли мир". Мэрилин Монро и Джо Ди-маджио.
15.55 "Она написала убийство".
16.50 Дог-шоу "Я и моя собака".
17.25 "Один день".
18.45 Профессия — репортер. Андрей Антонов. "Чужие".
19.05 Телеигра "О, счастливчик!"
19.50 Сериал "Улицы разбитых фонарей - II" . "Новое слово в живописи".
21.45 "Джеймс Бонд — агент 007". "Ты живешь только дважды".
23.50 Ток-шоу "Про это".

"КУЛЬТУРА"

9.05 "Читая Библию".
9.15 "Аистенок".
9.40 Галина Кравченко в фильме "Кукла с миллионами".
10.55 "Мировая деревня".
11.10 "Гражданская война в Америке". Документальный сериал.
12.20 М.Равель. "Вальс".
12.35 Графоман.
13.00 Рассказы старого сплетника. "Анатолий Эфрос на телеэкране".
13.30 Новости культуры.
13.45 Худ. фильм "Картонная свадьба". 1-я серия.
14.30 Цирковой чемодан. "Клоун Май".
14.55 Отечество и судьбы. "Бенуа". Часть 1-я.

"МОГИЛЕВ-1"

15.00 "Джой".Фильм—детям.
16.40 "Праздник в Вашем доме".
17.40 "Новые приключения ментов".Телесериал.
18.30 "Праздник в Вашем доме".
19.30 Телемагазин.
19.40 "Малыш и Богес".Мелодрама.
21.25 Телелоцман.
21.45 Астро-дайджест.
21.55 "Тесты для настоящих мужчин".Мелодрама.
23.05 Диск-канал.
23.35 "Ножницы".Триллер.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
8.00—16.30 ТНТ.
16.30 Мультфильмы.
17.00 "Поздравления".
18.00 "Благая весть с Риком Реннером".
18.30 "Поздравления".
19.30 Индийское кино "Горькая правда".
21.50 Высокая мода.
22.00 "Возвращение в затерянный мир". Фантастика.
23.30 Спортивная программа.

•• Воскресенье, 13 февраля ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 "Приключение в королевстве".
8.26 Телебарометр.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.10 "Все дело в шляпе".
9.35 "Я рисую".
9.50 Мультиклуб.
10.10 Туробъектив.
10.35 "Все нормально, мама!"
11.10 Белорусский дом.
11.40 Арсенал.
12.05 Спортивные новости.
12.20 Сделано в Беларуси. Акционерное общество "Світанак".
12.35 Телевизионный Дом кино.
13.05 Док.сериал "Сокровенные люди".
13.20 Водевиль "Проделки в старинном духе".
14.30 Сельчане. Толочинский район.
15.15 "На волне взаимопонимания".
15.55 Зорная ростань.
16.25 "Суперобраз XXI века".
16.55 Теленавигатор.
17.20 Концерт, посвященный вручению премий "За духовное возрождение" и специальных премий деятелям культуры и искусства за 1999 год.
18.40 "Кофе с ароматом женщины".
19.20 Премьера песни.
19.35 Стадион.
20.00 Резонанс.
20.50 Ток-шоу "Карамболь" с участием 1-й белорусской антарктической экспедиции.
21.25 Л.Полищук и В.Тихонов в социальной мелодраме "Любовь с привилегиями".
23.35 Авто-парк.
23.45 Столичный хит.

ОРТ

7.00, 9.00, 14.00 Новости.
7.10 Служу России!
7.40 "Дисней-клуб": "Гуфи и его команда".
8.10 Утренняя звезда.
9.10 "Непутевые заметки" .
9.30 Пока все дома.
10.00 Семейная комедия "Альф".
10.30 Здоровье.
11.00 Лидия Смирнова в комедии "Дача".
13.00 Клуб путешественников.
13.40 История одного шедевра. Русский музей.
14.10 "Горец". "Пациент N 7".
15.00 Умницы и умники.
15.25 "Дисней-клуб": "101 далматинец".
15.50 "Дисней-клуб": "Новые приключения Винни-Пуха".
16.15 Как это было. Хоккейная суперсерия СССР — Канада. 1972 год.
16.55 Анна Козакова в программе "Женские истории".
17.25 Смехопанорама.
18.00 "Невзоров". Телепрограмма.
19.00 КВН — 2000.
21.05 Информационная программа с П.Шереметом.
22.05 Киану Ривз в фильме "Дракула Брэма Стокера".

"РОССИЯ"

7.00 Служу Отечеству.
7.25 Папа, мама и я — спортивная семья.
8.20 "Устами младенца".
8.55 Доброе утро, страна.
9.30 "Аншлаг" и К°.
10.30 Ретро-городок.
11.00 Русское лото.
11.40 "Крот и автомобиль". Мультфильм.
12.00 Вести.
12.20 Парламентский час.
13.05 Старая квартира. 90-е годы.
14.05 Диалоги о животных.
15.05 "Закон и порядок".
16.00 Документальное кино. "Свет его звезды".
17.00 Перед "Зеркалом".
17.20 Б. Щербаков, Т. Догилева, Т. Васильева и Л. Удовиченко в кинокомедии "Жених из Майами".
19.00 Зеркало.
20.00 "Библия". "Соломон". 2-я серия.
21.40 Праздничный концерт, посвященный 11-летию ГУБОП.
23.00 Михаил Козаков и Евгений Стеблов в фильме "Ужин в четыре руки".

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
7.20 "Улицы разбитых фонарей - II" . "Новое слово в живописи".
8.15 Телеигра "О, счастливчик!"
9.15 Служба спасения.
9.40 Пойми меня.
10.15 Путешествия натуралиста.
10.45 Фитиль.
11.25 "Полундра". Семейная игра.
11.55 "Женский взгляд".
12.25 "Ключи от форта Байяр".
14.00 "Криминальная Россия". "Сибирский потрошитель". 2-я серия.
14.30 Профессия — репортер. Андрей Антонов. "Чужие".
15.35 Большие родители.
16.05 Документальный сериал "Холодная война".
16.55 "Она написала убийство".
18.00 Итоги.
19.35 Куклы.
19.50 "Улицы разбитых фонарей - II" . "Королева красоты".
20.50 "Итого".
21.10 Бубба Смит в комедии "Полицейская академия". Фильм 5-й.
22.50 "Третий тайм".
23.40 Джеффри Комбс и Барбара Крэмптон в фильме "Извне".

"КУЛЬТУРА"

9.05 "Читая Библию". Новый Завет.
9.15 "Аистенок".
9.40 "Приключения Иоанны". Худ. фильм.
11.05 "Консилиум".
11.30 "Играем басни Крылова". Режиссер В.Фокин.
12.05 "Цирковой фургон". Мультфильм.
12.30 "Музыка жизни". И.Архипова.
13.00 "Мой Эрмитаж".
13.30 Новости культуры.
13.45 "Картонная свадьба". Худ. фильм. 2-я серия.
14.35 Кино вчера и всегда. Авторская программа В.Божовича.

"МОГИЛЕВ-1"

15.00 "Скарбы"."Беларускі ручнік".
15.25 "Приключения Папируса". Мультсериал.
16.15 "Илья Муромец". Фильм—детям.
17.45 "Блеф-клуб".
18.25 "Новые приключения ментов".Телесериал.
19.10 Телемагазин.
19.20 "Поли". Приключения.
20.45 Астро-дайджест.
20.55 "Сибирский цирюльник". Драма.

2 КАНАЛ

7.00 "Энергетический завтрак".
8.00—16.30 ТНТ.
16.30 Мультфильмы.
17.00 "Поздравления".
18.00 Джойс Майер. "Жизнь в слове".
18.30 "Поздравления".
19.30 "Маппетс-шоу".
19.55 "Внеземной разум. Контакт". Док. фильм.
21.20 Высокая мода.
21.30 Комедия "Флаббер".
23.00 Спортивная программа.

САМІ ПРА СЯБЕ

ПРАЦОЎНЫ ТЫДЗЕНЬ НАЧАЛЬСТВА

Кожны тыдзень упраўленьне арганізацыйна-кадравай работы аблвыканкама складае пералік мерапрыемстваў, якім на пазначаны час надаецца найбольшая ўвага. Гэты сьпіс даволі руцінных чыноўных клопатаў аблвыканкама рассылаецца кіраўнікам адпаведнага ўзроўню для арыентацыі. Дакумэнт адкрыты, бо раздаецца таксама акрэдытаваным журналістам.

Тым ня менш грамадзтву рэдка калі ўдаецца дазнацца, а чым жа канкрэтова занятае ягонае начальства цэлы тыдзень (здаецца, ці ня два гады таму такі анонс спрабавала рабіць газэта «Магілёўскія ведамасьці», але – кінула). Журналісты, відаць, палічылі, што нічога цікавага для людзей у пераліку паседжаньняў, нарадаў, сэмінараў, розных там «заслухоўваньняў і справаздачаў», якія і складаюць працу начальства, няма.

І дарэмна. Бо ня так ужо ўсё шэра і руцінна ў начальніцкіх клопатах і буднях. Ёсьць і ў іх свае маленькія радасьці.

Вось прыклад з апошніх. У пераліку «Основных мероприятий», якія праводзілі на гэтым тыдні камітэты, упраўленьні і аддзелы аблвыканкаму, увагу да сябе як магнітам прыцягнуў радок пра канцэрт А. Малініна. Пабач усё нецікавае: «оперативное совещание... заседание штаба...», далей яшчэ больш жудаснае – «защита мероприятий экономического развития...». І раптам: канцэрт! Малінін!

Няцяжка ўявіць сабе, якой зайздрасьцю адгукнуўся гэты радок дакумэнта ў сэрцах калегаў па аблвыканкаму, якія працуюць ў вытворча-галіновых аддзелах і таму мусяць займацца рознымі там «эканамічнымі зашчытамі». Няцяжка, відаць, прадбачыць і рэакцыю разгубленай грамадзкасьці: бач ты, што робіцца... а мы-та думалі...

Нямала, мы ўпэўненыя, зьдзівіўся б і *Сам* Аляксандар Малінін, калі б даведаўся, што ён ня проста прыехаў у Магілёў з канцэртам, каб парадаваць прыхільнікаў раманса пра паручыка Галіцына, а яшчэ і дазволіў схавацца за сваім прозьвішчам цэламу аддзелу аблвыканкама, які паводле «Основных мероприятий» патрапіў у самыя адказныя за мерапрыемства, бо пазначаны ў графе: «Кто проводит». Без упраўленьня культуры Малінін ня змог бы даць канцэрт?

Хаця, хто яго ведае, можа і так.

Уласны камэнтар

(Падаем сканіраваны фрагмэнт дзелавой паперы).

ОСНОВНЫЕ МЕРОПРИЯТИЯ,
проводимые комитетами, управлениями и отделами
Могилевского облисполкома **с 31 января по 6 февраля 2000 года**

Дата проведения	Наименование мероприятий	Кто проводит	Время и место проведения
31 января понедельник	Оперативное совещание у председателя облисполкома Дражина М.В.		8.00 Дом Советов, кабинет председателя облисполкома
31 января понедельник	Заседание штаба по строительству Ледового дворца.	Комитет по строительству, стройиндустрии и территориальному развитию	14.00 г. Могилев, Ледовый дворец
31 января понедельник	Концерт А. Малинина.	Управление культуры	18.30 г. Могилев, ДК и Т «Химволокно»
1 февраля вторник	Защита мероприятий производственно-экономического развития агропромышленного комплекса Дрибинского и Горецкого районов в 2000году	Комитет по сельскому хозяйству и продовольствию	10.00 Дрибинский райисполком 14.00 Горецкий райисполком
2 февраля среда	Областной семинар социальных педагогов вспомогательных и специальных школ, специальных классов общеобразовательных школ «Социальная адаптация воспитанников вспомогательных и специальных школ».	Управление образования	10.00 г. Могилев, вспомогательная школа
2 февраля среда	Заседание постоянной комиссии областного Совета депутатов по аграрным вопросам, земельным отношениям, проблемам чернобыльской катастрофы, экологии и природопользованию	Управление организационно-кадровой работы	11.00 Дом Советов, каб. 107

АДКУЛЬ НАШ РОД

У Магілёве амаль месяц як адчыніўся этнаграфічны музэй. Дакладней будзе сказаць, што ён аднавіўся. У 1996 годзе музэй зьвярнуў сваю экспазыцыю, якая была адкрытая для гледача ў прыстасаваным будынку па вуліцы Сялянскай.

Гэты час супрацоўнікі разам з мастакамі распрацоўвалі новую канцэпцыю існаваньня музэю. Па словах Сьвятланы Рыбаковай, загадчыцы магілёўскага філіялу, стары будынак не задавальняў патрэбаў па плошчы, якая патрабавалася для больш абноўленай экспазыцыі. Зараз фонды музэю налічваюць вельмі шмат адзінак, а на сёньняшняй экспазыцыі прадстаўлена недзе шостая іх частка. Для тых, хто цікавіцца матэрыяльнай і духоўнай культурай нашае малое радзімы – Магілёўшчыны, не складзе, зразумела, аніякае праблемы пабачыць фонды музэю цалкам.

Ідэю экспазыцыі этнаграфіі Магілёўшчыны можна акрэсьліць так: паказ матэрыяльнай культуры праз духоўную. Бо як мы ведаем з гісторыі Беларусі, сярод нашага люду вельмі моцна разьвітым было менавіта паганства (язычество – *руск.*), якое пакінула вялікі адбітак як на матэрыяльнай, так і на духоўнай спадчыне беларуса. У гэтым нас яшчэ раз запэўняць экспазыцыі, якія паказваюць моманты сьвяткаваньня паганскіх сьвятаў (каляды, купальле і г. д.).

Для кожнага са сьвятаў адведзена сваё месца, усе яны разьведзены па сэзонах. Таксама можна заўважыць, што рушнікі ці адзеньне, якія належалі прадстаўнікам розных раёнаў, ня ёсьць аднолькавымі.

Калі апынаешся ў атачэньні такой колькасьці прадметаў, якія маглі б багата чаго расьпавесьці, калі мелі б чалавечую мову, сапраўды бачна, што ўсе намаганьні супрацоўнікаў не прайшлі дарма: мэта экспазыцыі поўнасьцю спраўдзілася.

На жаль, музэйная заля не адзначаецца люднасьцю, наведвальнікі не стаяць у чарзе па квіткі. Але ж у нас гэта ніяк ня сьведчыць аб правале ідэі.

Усе дакумэнтальныя і друкаваныя матэрыялы выставы зроблены ў беларускай мове, як і было задумана на пачатку. Фонд музэю адкрыты для аматараў беларускай культуры і для прыманьня новых экспанатаў ад жыхароў магілёўшчыны. Супрацоўнікі будуць вельмі ўдзячныя ўсім, хто перадасьць ім новыя цікавыя ўзоры нашай мінуўшчыны.

Усе жадаючыя пабачыць быт нашых прадзедаў запрашаюцца наведаць экспазыцыю, якая цяпер стала дзее ў Музэі этнаграфіі па адрасе: вул. Першамайская 8 (насупраць кафэ «Пінгвін»).

Дзяніс НОВІКАЎ,
карэспандэнт «ТМ»



ЯК ВЫЕХАЦЬ З САВЕЦКАГА ПАРКУ

Адна з самых «савецкіх» сацыяльна-пабытовых праблемаў, як вядома, – грамадзкі транспарт. Па ступені ягонага разьвіцьця даволі дакладна можна меркаваць аб тым, наколькі прасунуліся ў краіне капіталістычныя (рынкавыя, як мы гаворым для «мяккасьці») рэформы. Шыкоўны і камфортны, дакладны і ветлівы грамадзкі транспарт у цывілізаваных краінах ходзіць напаўпустым. Любая супынка руху грамадзкага транспарту ў нас можа выклікаць (і часамі выклікае) напружаньне і нават сацыяльныя ўзрушэньні. Рэзкае падвышэньне кошту праезду сваім наступствам мае тое, што людзі наогул кідаюць плаціць. Увядзеньне кандуктараў прыводзіць зь цягам часу да «баланса» інтарэсаў: пасажыры спраўна плоцяць гэтым спрытным кабетам і хлопцам, аднак грошы не даходзяць да транспартных бугалтэрыяў. Ускласьці ўсе расходы на падтрыманьне грамадзкага транспарту на прадпрыемствы немагчыма – больш, чым 2-3 працэнтовы падатак на іх не ўскладзеш...

Увесь гэты комплекс праблемаў прывёў магілёўскі грамадзкі транспарт да плачэўнага стану, аб якім ведае кожны, хто ім карыстаецца. Ведае і начальства.

Яно ведае, у прыватнасьці, што запазычанасьць аўтобуснага парку пастаўшчыкам нафтапрадуктаў складае на пачатак года 22 мільёны дэнамінаваных рублёў. Яно ведае, што з парку выходзяць сёньня толькі тыя аўтобусы, што ходзяць на бэнзыне, а гэта «ікарусы», у большасьці зь якіх выпрацаваны пашпартны рэсурс. Яно ведае, што на дызэльнае паліва ў парку няма грошай, бо салярка падаражэла ў 10 разоў.

Яно ведае, што транспарт, якім людзі карыстаюцца, каб даехаць у іншы горад, ратуецца пастаянным падвышэньнем коштаў квіткоў, а прыгарадны – адменай маршрутаў.

Яно ведае, што тралейбусны парк вінны энэргэтыкам проста незьлічоныя грошы. Што тралейбусы з-за няспраўнасьцяў сыходзяць з маршрутаў альбо напросту гарадзь. Што тралейбусныя слупы-апоры час ад часу падаюць ад старасьці, на шчасьце пакуль нікога не забіўшы...

Чаго ж начальства ня ведае? Толькі таго, што з гэтым клубам праблемаў рабіць. Ды ці ёсьць выключэньнем грамадзкі транспарт? Вечныя савецкія праблемы вяртаюцца ў нашае жыцьцё так шпарка, што незразумела: за якія «нізкія тэмпы разьвіцьця» лае сваю «вэртыкаль» Аляксандар Лукашэнка. Здаецца, яна робіць усё магчымае.

Рэдакцыйны АГЛЯДАЛЬНІК сацыяльных праблемаў

СУЧАСНЫЯ ЗАНАТОЎКІ

НАС БУДЗЕ БОЛЬШ

Ад рэдакцыі. ***Днямі да нас завітаў магілёўскі мастак і народнафронтавец Валеры Разумаў. Тыя, хто зь ім знаёмыя, ведаюць, што Валеру лягчэй (жарт, зразумела) адседзець трое сутак у пастарунку, чым выканаць «пісьмовае» даручэньне арганізацыі. Аднак гэтым разам ён прапанаваў менавіта сваё пісьмовае практыкаваньне: паглядзіце, можа надрукуеце, усё ж гэта гісторыя...***

Тое былі занатоўкі пра кастрычніцкі Марш Свабоды. Нашыя сумневы наконт таго, што гэты «матэрыял» ня новы, што незалежныя журналісты апэратыўна й падрабязна распавялі пра менскую дэманстрацыю, а «дзяржаўныя» прапагандысты таксама апэратыўна перамазалі яе брудам, – былі нядоўгімі. Бо й праўда, гэта найноўшая беларуская гісторыя, якую спадчыньнікі, магчыма, будуць пісаць зь вялікай літары. А калі так, кожны сумленны расповяд непасрэднага сьведкі, а тым больш удзельніка, – важкі.

Такі расповяд перад вамі...

Зьбірацца людзі на плошчы Якуба Коласа пачалі а 12-й гадзіне. Нашая даволі ўнушальная магілёўская група рассыпалася, як гаворыцца, па інтарэсах: тыя, каго вылучылі ў дружыну, пайшлі інструктавацца, адны пасьпяшаліся туды, дзе гучалі беларускія песьні і граў гармонік, іншыя далучыліся да тых, хто абступіў Славаміра Адамовіча, які гучна чытаў свае вершы, трэція прыслухоўваліся да гурткоў, якія ўтварыліся вакол Юрася Хадыкі, Міколы Статкевіча, Станіслава Багданкевіча. Мяне ахутала нейкая абсалютная радасьць. Паўсюль гучала родная мова, луналі бел-чырвона-белыя сьцягі, людзі былі ў добрым прыўзьнятым настроі як гэта бывае на сапраўднае сьвята, чуліся жарты, сьмех. Было відавочна, што людзей рознага ўзросту, сацыяльнага стану сюды прывяла любоў да Бацькаўшчыны, жаданьне бачыць яе вольнай, цывілізаванай, заможнай краінай.

Згодна раней абумоўленага маршрута шматтысячная калёна дэманстрантаў рушыла па праспэкце Скарыны ў бок Акадэміі навук. Аднак калёна не перашкаджала руху тралейбусаў, аўтобусаў, лёгкавушак, як гаворыцца, усе мірыліся. Больш таго, з усіх аўтобусаў і тралейбусаў нам усьміхаліся, вітальна махалі рукамі, падымалі ўгору вялікія пальцы. На прыступках Дома друку нас вітала вялікая група журналістаў. Патрульныя міліцыянтаў, якія былі выстаўленыя ўздоўж праспэкта і далей па ўсяму маршруту да плошчы Дружбы народаў, дэманстранты ў сваю чаргу віталі пытаньнем: «Дзе ваш былы міністар Юры Захаранка?» Адныя «з разуменьнем» усьміхаліся, іншыя рабілі выгляд, што ня чуюць, трэція апускалі вочы.

Мітынг на плошчы быў непрацяглым. Рэзалюцыя ўтрымвала тыя ж лёзунгі і заклікі, якія гучалі ў шэрагах, былі бачныя на плякатах і транспарантах: Жыве Беларусь! Свабоду палітвязьням! Не – ганебным дамовам з Расеяй! Галаўная частка калёны разгарнула над сабой велізарны (20Х20 мэтраў) нацыянальны сьцяг і такі ж сьцяг Эўразьвязу, што выклікала ажыўленьне і апладысмэнты. У добрым настроі дэманстранты рушылі ў кірунку плошчы Свабоды. Мінаючы корпус Акадэміі ўнутраных справаў, мы заўважылі, што ўсе вокны былі «залепленыя» курсантамі. Людзі з калёны клікалі іх за сабой, крычалі ім, што яны, гэтыя заўтрашнія афіцэры – надзея вольнай Беларусі. З вокнаў толькі ўсьміхаліся, а дзе-нідзе вітальна махалі рукамі. Няўпрыкмет дайшлі да скрыжаваньня вуліцы Казлова і праспэкта Скарыны. Раптам пачулася: Заслона! Назад! Паварочвай! Як хутка зразумелася, гэта была першая спроба правакацыі з боку АМОНА. Аднак калёна своечасова зрэагавала, зладжана перанесла, перадаючы з рук у рукі, вялізныя сьцягі, і бяз страты тэмпу і рытму павярнула куды трэба. Не прайшлі і сто крокаў, як новая правакацыя: з аднаго з жылых пад'ездаў паваліў чорны дым. Ніхто з дэманстрантаў не сумняваўся, што падпал (хутчэй за ўсё гэта было нейкае спэцыяльнае міліцэйскае прыстасаваньне) зрабілі амонаўцы, каб унесьці ў шэрагі дэманстантаў паніку, а ў пабочных людзей, якія ішлі ў гэты час па сваіх справах, выклікаць варожасьць да ўдзельнікаў Маршу. Правакацыя не прайшла. Аднак цень нейкай трывогі, відаць, міжволі насоўвалася не на аднаго мяне, бо сталася зразумелым: улада пойдзе на ўсё, каб выклікаць здарэньне.

Яно распачалося літаральна праз некалькі дзясяткаў крокаў, калі калёна дасягнула парку імя Горкага. Аднекуль пачуліся крыкі, пад ногі прыкацілася пераламанае дрэўка сьцягу, па плячы шмаргнуў пусты футляр ад фотаапарату, на вочы патрапіў мужчына з разьбітым тварам, побач зь ім плакала школьніца-дзяўчынка, па тратуары пракаціўся міліцэйскі шлем... Гэта першы міліцэйскі напад. Аднак з гэтымі 15-20 «сьмяльчакамі» хутка разабраліся, яны пабеглі, чуючы праклёны ў свой адрас, да вайсковай, крытай брэзэнтам машыны, і зьехалі зь месца. А далей, непадалёк ад моста праз Сьвіслач, нас сустрэла шчыльная, у некалькіх радоў, калёна амонаўцаў, узброеная шчытамі ад плечаў да зямлі і гумавымі доўгімі палкамі. Яна перакрыла дарогу такім чынам, што абмінуць было ніяк нельга. Кіраўнікі нашай калёны наблізіліся да міліцэйскіх шэрагаў для перамоваў. Уперадзе апынуўся і я. Зусім блізка ўбачыў насупленыя твары маладых хлопцаў у форме, якія па ўсяму былі гатовыя выканаць любы загад. Пачаў зь імі гаворку, заклікаў да сумленьня і вытрымкі, папярэдзіў, што зь цягам часу ім будзе сорамна за тое, што яны зьбіваюць сваіх жа родных людзей, такіх жа беларусаў як самі толькі за тое, што гэтыя людзі нязгодныя жыць пад чужынцамі, у беднасьці і няпраўдзе. На мяне закрычаў з-за сьпінаў амонаўцаў іхны начальнік, як я разгледзеў, капітан. Раптам першыя шэрагі міліцыянтаў расступіліся, з-за іх выбеглі з дубінкамі іншыя міліцыянты і пачалі кідацца на бяззбройных людзей, не пагледаючы на тое, хто перад імі: юнак ці чалавек сталага ўзросту, дзяўчына ці кабета. Запрацавала страшная бяздумная машына. Людзей кідалі на асфальт. Цягнулі ўглыб сваіх шэрагаў. Дэманстранты і выпадковыя мінакі (іх было шмат, бо побач парк культуры і адпачынку, а на вуліцы – нядзеля) пачалі лезьці на чыгунныя пікі паркавай агароджы, шчаміцца праз шчаліны. Уздоўж вуліцы зьбіраўся натоўп людзей, якія жылі побач, ішлі па сваіх справах. Многія былі зь дзецьмі. Нечакана міліцыянты кінуліся й на іх. Узьняўся гвалт. З боку гэтых людзей у амонаўцаў паляцелі каштаны, якія адскоквалі ад шчытоў з грукатам, але ніякай шкоды нападаючым не наносілі. Аднекуль паляцеў першы камень. Я бачыў як людзі ня толькі разьбіралі нейкую кіпеню асфальтавых абломкаў (дарогу рамантавалі), але й выпулпівалі камяні з бруку і кідалі іх у бок амонаўскіх шэрагаў. Аднак што можна было зрабіць супраць узброеных, трэніраваных міліцыянтаў? Людзі кідаліся хто куды, многія скочылі нават у раку (нагадаю, што на двары кастрычнік).

Пазьней па ўсяму Менску пачаўся традыцыйны хапун: міліцыянты затрымвалі кожнага, хто ім не падабаўся. Дзясяткі людзей, сярод якіх няма ла было выпадковых і ў нічым не вінаватых, правялі ноч на 18 кастрычніка ў пастарунках і камэрах. Актывісты Маршу Свабоды яшчэ доўга праходзілі праз суды. Многія атрымалі штрафы, шматсутачныя адседкі, былі выключаныя з навучальных установаў і звольненыя з працы...

Хутка новы Марш Свабоды. Няма сумневу, што да яго далучацца тыя, хто на свае вочы бачыў тым кастрычніцкім днём сапраўднае аблічча ўлады. Нас будзе больш.

Валеры РАЗУМАЎ,
магілёвец, удзельнік Маршу Свабоды-99



ГЕАПАЛІТЫКА ВАЧЫМА НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ

ШТО ТАМ, ЗА ДАЛЯГЛЯДАМ?..

Намаганьнямі сёньняшніх беларускіх уладаў і расейскай палітычнай эліты зноў стала актуальнай праблема інтэграцыі-інкарпарацыі-акупацыі нашай краіны. Менавіта так можна прадставіць увесь спэктар поглядаў на гэтую праблему, хаця афіцыйныя Менск ды Масква закрываюць вочы на другі і трэці пункты погляду. А дарма, бо абедзьве сталіцы маглі б пачэрпнуць шмат карыснага ад сваіх палітычных апанэнтаў. Дзеля справядлівасьці трэба адзначыць, што правая частка маскоўскай эліты больш рэальна глядзіць на рэчы, калі вуснамі Чубайса заявіла, што рэальнае аб'яднаньне магчымае толькі як уваходжаньне (інкарпарацыя) Беларусі ў Расейскую Фэдэрацыю.

Здаецца, і Лукашэнка зразумеў, што славянскае братэрства, савецкае мінулае і праваслаўная еднасьць, гарачыя пацалункі ня надта трывалы падмурак яднаньня, калі за гэты жэст яго не пускаюць у Крэмль. Ідзе, як гэта бачна ўсё больш яскрава, звычайны палітычны гандаль.

Расейскі бок шукае выгодаў для сваёй дзяржавы, падтрымліваючы ў народзе імпэрскую самасьвядомасьць, а беларускі кіраўнік – толькі для сябе і сваёй кар'еры, а ніяк не для дзяржавы, а тым больш для беларускага народу.

Але праблема ў тым, што справы на Беларусі няўхільна пагаршаюцца і ейны «кошт», а зь ім і стаўкі Лукашэнкі, катастрафічна падаюць. Чаго ня скажаш пра Расею, якая ўтрымліваецца пакуль на плыву. Можа стацца так, што праз год «гандляваць» тут ужо ня будзе чым, і за сваё выратаваньне А.Л. давядзецца яшчэ «даплочваць», згадзіўшыся на любыя ўмовы Масквы.

Што ж выйграе Расея ад паглынаньня такога «салодкага кавалка» як Беларусь? Стратэгічныя выгады відавочныя: «усходні калідор», «беларускі шчыт», «заходні плацдарм». Эканамічныя выгоды сумнеўныя, бо непад'ёмныя калгасы ды «запушчаныя» заводы запатрабуюць нямала сродкаў. А палітычныя «выгоды» ад зьліцьця з дыктатурай увогуле непрадказальныя і нават небясьпечныя.

Давайце глянем на гэта прагматычна.

Тое, што Расея і СССР былі клясычнымі імпэрыямі, сёньня не выклікае пярэчаньняў. А імпэрыі калісьці зьнікаюць, якімі б вялікімі яны не былі – Рымская, Брытанская, Атаманская ці Савецкая. Хіба што спосабы разбурэньня розныя – адны зьнікаюць у выніку войнаў і рэвалюцыяў, другія – ў выніку рэформаў і мірных канфэрэнцыяў. Апошніх прыкладаў значна менш, а найбольш вядомы – брытанскі. Але сыход ангельскіх калянізатараў і доўгае існаваньне іхнага «СНГ» – Брытанскае Садружнасьці – ёсьць ня столькі прыкметай розуму і дальнабачнасьці лёнданскіх стратэгаў, колькі асаблівасьцю іхнага гістарычнага шляху.

У Расеі зусім іншыя абставіны, і таму брытанскія рэцэпты тут мала ўжытковыя. Асаблівасьці Расеі, на мой погляд, у тым, што:

1. Мэтрапольны народ (рускія й тыя, хто такімі сябе вызнаюць) складае прынамсі 2/3 насельніцтва.

2. Занадта моцная эканамічная і культурная залежнасьць ад мэтраполіі.

3. Вялікая колькасьць дробных, глыбока асыміляваных народаў пры адсутнасьці шматлікіх народаў з моцнымі этна-культурнымі традыцыямі.

Усё гэта, ды яшчэ на фоне імпэрска-рэваншысцкіх настрояў «пакрыўджанага» сярэдняга расейца стварае цяжкасьці для хуткай (рэвалюцыйнай) сувэрэнізацыі, але дае магчымасьць дамагацца яе праз эканамічныя і сацыяльныя рычагі. Менавіта хуткі эканамічны пад'ём нацыянальных аўтаноміяў, мэтанакіраваная адукацыйная і культурная самастойная палітыка ствараюць умовы для станаўленьня будучых дзяржаваў. І ў тым, што на месцы вялікай разбэшчанай імпэрыі зьявяцца па-людзку ўладкаваныя краіны-гаспадарствы, я ня бачу нічога кепскага. Галоўнае, каб людзі ў гэтых краінах жылі лепш. У рэшце рэшт, вырашаць гэта самім людзям...

А пакуль прыйшлі часы махлярства і парадоксаў. Адзін зь іх – расейска-беларуская «дружба». Афіцыйным Маскве ды Менску не патрэбная заможная й вольная Беларусь, бо народ такой краіны не захоча ў Расею. Лягчэй загнаць туды галоднага і змардаванага чалавека, паманіўшы яго прывідам маскоўскай свабоды з таннымі энэрганосьбітамі. Аднак для Лукашэнкі ўмацаваньне цэнтральнае ўлады ў Расеі – гэта неспрыльная хада падзей, бо відавочна, што Пуцін сам хоча дадаць да свайго тытулу – «... і Белае Русі». Вось такая зараз атрымліваецца «дружба». Нездарма кажуць: лепш мець добрага суседа, чым недарэку-сваяка.

А. ТРОШКА

СЬВЯТА Ў КАСЬЦЁЛЕ

ЖЫВІЦЕ ДАБРОМ І ЛЮБОЎЮ

Урачыстая інагурацыя новага ксёндза-пробашча Магілёўскай парафіі й касьцёла Сьвятога Станіслава была падобная на вялікае сямейнае сьвята.



Па-першае, ксёндз Роман два гады працаваў з былым ксёндзам-пробашчам Уладзіславам, а потым сем гадоў быў на послугу ў Бабруйску. Па-другое, магілёўцы ведаюць, што менавіта ксёндз Роман быў ля вытокаў (выконваў абавязкі дырэктара) першых фэстываляў «Магутны Божа». Таму ўрачыстасьць больш нагадвала цёплую сустрэчу, своеасаблівае вяртаньне дадому. Усхваляваны ксёндз-пробашч Роман Факсінскі, апрануты ў строй колеру сьвятла і надзеі, прымаў вітаньні ад руку жанчын-маці і ад кола сям'яў.

Сталыя кабеты ўзгадалі першую сустрэчу з маладым польскім пастырам дзесяць год таму ў капліцы на польскіх могілках, і як ён шчодра марыў у мальбе каб вярнуцца і служыць на магілёўскай зямлі, і цяпер кветкамі ды ўзьнёслымі словамі віталі яго. Яны зычылі яму радасьці штодзённай працы на шляху да жыцьця вечнага.

Касьцёльныя дзяўчынкі, упрыгожаныя трапятлівымі вясновымі кветкамі, шматкаляровымі суквецьцямі лета, шчодрымі дарункамі восені, вытанчанай халоднасьцю зімы, пад гукі бадай што самай пяшчотнай беларускай мэлёдыі «Перапёлачка» зычылі ксяндзу, каб несла вера яго вялікую вясновую радасьць, каб праца была ахутана жыцьцятворчай цеплынёй лета, каб захавала ягонае сэрца чысьціню сьнега і на ўсім зямным шляху была зь ім мудрасьць восені.

Расчулены ксёндз Роман, распачаўшы свой зварот словамі: «Мае дарагія, залатыя, сробраныя браты й сёстры...», аддаў падзяку ксёндзу-пробашчу Уладзіславу Бліну за тое, што ён заснаваў тут гэткую прыгожую, жывую касьцёльную сям'ю. І ў шчырай мальбе аб тым, каб слухаючы Пана Бога сэрцы не зачыняліся, не зрабіліся жорсткімі, узгадаў эвангельскую прытчу паводле апостала Марка аб першым цудзе. Калі жменька людзей слухала Езуса, а вакол быў натоўп, заклапочаны толькі хлебам будзённым, і ня чуў яго. А калі задаволіў Езус усіх хлебам, то людзі пажадалі зрабіць яго сваім валадаром. Езус моўчкі пакінуў іх. Ён шкадаваў усіх людзей, але ня хацеў быць царом. Ён хацеў, каб яны самі адказвалі за сваё жыцьцё, прымаючы ў сэрцы свае сьвятыя запаветы дабрыні і любасьці... Спрадвечная прытча актуальная й сёньня.

Малітва веры – першая малітва новага ксяндза-пробашча гучала ў цішыні храма, поўнага вернікаў. І кожны зь іх, малы й стары, усхвалявана паўтараў пра сябе гэтыя словы мальбы за тых, хто ў сумненьні, хто страціў веру ці наогул не прыйшоў да яе.

«Узмацні свой Народ, адкрый вочы на пакуты іншых, дай плён у працы на родны край». Прылюдным прызнаньнем у каханьні, удзячнасьцю за адкрытыя сэрцы ды абяцаньнем працягнуць добрыя традыцыі тутэйшай касьцёльнай сям'і завершыў новы ксёндз-пробашч урачыстую імшу.

Алена БАРЫСАВА

ШАХ МАТ КУТ

МІХАСЯ БУЛАВАЦКАГА

СУСТРЭЧА І

Як бы чалавек ні быў заняты важнымі і сур'ёзнымі справамі, калі-нікалі надараецца й вольны час – то ў цягніку, то на якім адпачынку, то яшчэ дзе. Добра было б ня проста прабавіць гэты час, але з карысьцю для цела, душы ці розуму. Паспрыяць гэтаму мае намер «ТМ» і ягоны заўзяты аўтар.

Падумаўшы аб тым, як можна паспрыяць інтэлекту нашых чытачоў (бо мы мяркуем – і маем таму пацьверджаньні – што нашу газэту чытаюць людзі, інтэлектуальна не пракіслыя), мы абралі шахматы. Гэтая старажытная і мудрая гульня з доўгай аброслай легендамі і паданьнямі, вершамі і раманамі, скандаламі і матэматычнымі дасьледаваньнямі гісторыяй валодае невычэрпным патэнцыялам і справядліва прыцягвае ўвагу людзей – ад самых маленькіх да самых вялікіх.

Спадзяемся, што і сярод нашых чытачоў нямала аматараў шахмат. Ім і прызначаны наш «Кут». А каб карыснае можна было сумясьціць з прыемным, прапануем для пачатку невялікі конкурс зь дзесяці эцюдаў-мініяцюраў.

УМОВЫ КОНКУРСА ТАКІЯ. **На працягу пяці дзён пасьля выхаду газэты з чарговым заданьнем трэба даслаць поўнае рашэньне эцюда на адрас: *212030 Магілёў, а.с. 3.* Пажадана пры гэтым назваць аўтара (ці аўтараў) эцюда, за што будуць налічаны дадатковыя балы. Бо прозьвішчы стваральнікаў прыгожага трэба ведаць. А эцюды мы будзем выбіраць прыгожыя. Ацаніце хаця б першы.**

Прызам для тых, хто зь ім справіцца, будзе кніга, якая дапаможа Вам удасканаліць сваё шахматнае майстэрства. А колькасьць прызоў будзе залежаць ад актыўнасьці ўдзельнікаў: пры наяўнасьці больш за 10 удзельнікаў прызы атрымаюць тры пераможцы; калі ўдзельнікаў будзе ад пяці да дзесяці, прызы атрымаюць два пераможцы; калі ж удзельнікаў будзе менш чым пяць, прыз атрымае толькі адзін пераможца.

Ну дык гайда да дошкі!

Заданьне 1



Белыя: Кр*b6*, п*c6* (2).

Чорныя: Кр*a1*, Т*d5* (2).

Белыя пачынаюць і перамагаюць.

Зычым посьпехаў!

(Выкарыстаныя скарачэньні: Кр – кароль, Т – тура, п – пешка. Беларускія назвы іншых шахматных фігур пададзім у наступны раз).

Адказы дасылайце (ці перадавайце непасрэдна ў рэдакцыю) да серады 9-га лютага. Да новых сустрэч!

КАТАЛЁГ

аўдыё-відэа касэтаў, кампакт-дыскаў беларускіх музыкаў

АЎДЫЁКАСЭТЫ СОЛЬНЫЯ АЛЬБОМЫ

УЛІС «Чужаніца»
УЛІС «Краіна доўгай белай хмары»
УЛІС «Танцы на даху»
УЛІС «Live 1996»
УЛІС «Блуканьне»
Крама «Хворы на рок-н-рол»
Крама «Гэй, там, налівай»
Крама «Лепшыя песьні»
Крама «Што дапаможа нам»
Крыві «Hei-Loli»
Крыві «За туманам»
Новае Неба «Дзеці чорнага гораду»
Новае Неба «Сон у трамваі»
Новае Неба «Go Home»
Новае Неба «Мая краіна»
NRM «Ла-ЛаЛаЛа»
NRM «Одзірыдзідзіна»
NRM «Акустычныя канцэрты канца 20 стагодзьдзя»(падвоены)
NRM «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.»
Народны Альбом супольны праект
Алмазный Фронт «Жизнь в городе без моря»
Атами «Язык стволов»
Tornado. «Apeman»
Stokes «No Escape»
Ravens «Mirror»

АРХІЎ

БОНДА «Лепшыя песьні»
Зіндан «Лепшыя песьні»
Мроя «Песьні з альбомаў 1988-90г.г.»
Мясцовы час «Наша Ўскраіна»

ЗБОРНЫЯ ПРАГРАМЫ

Запаты фонд беларускага рок-н-ролу вып. 1
Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты.
Запаты фонд беларускага рок-н-ролу вып. 2
Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы.
Запаты фонд беларускага рок-н-ролу вып. 3
Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько и Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Залаты фонд беларускага рок-н-ролу вып. 4
Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЗАПІСЫ

Беларускія народныя казкі
Г. Х. Андэрсэн. Стойкі алавянны салдацік (інсцэніроўка)
В. Гаўф. Каліф-бусел (інсцэніроўка)
Л. Пранчак. Цік-так ходзікі. (песьні, вершы, казкі).
В. Серых. Дзень-залацень.

КАМПАКТ-ДЫСКІ

Бонда (падвоены)
Крама «Што дапаможа нам»
Крыві «Людзям»
Новае Неба «Выбранае»
Новае Неба «Cepeliny»
NRM Акустычныя канцэрты (падвоены)
NRM «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.»

ВІДЭАКАСЭТЫ

Беларускі Рок-н-рол. Тэлеверсыі фэстываляў «Рок па вакацыях-96» і «Рок-каранацыя-96»
Рок-каранацыя-97
Рок-каранацыя-98
Folk назаўжды. Крыві. Сьвята. Сваякі. Палац.

КНІГІ

«Новы дамавікамэрон», «Кантамінацыі» Адама Глёбуса
Часопіс «ARCHE», №№ 1 – 4
«Сто вякоў беларускай гісторыі» Г. Сагановіча, У. Арлова
Вершы Л.Геніюш

Усё пералічанае ў каталёгу можна набыць альбо замовіць, патэлефанаваўшы 25-57-85, альбо 22-97-82, спытаць Алеся Асіпцова.

Рэдактар Генадзь СУДНІК

Тыднёвік Магілёўскі

Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадзкой асацыяцыяй «КОЛА СЯБРОЎ».
Зарэгістраваная ў Дзяржкамітэце РБ па друку за № 831.
Штотыднёвік

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 212030, г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.

Тэлефон: 31-04-15,
Тэл./факс: 22-97-82,
E-mail: krug@user.unibel.by

Газэта надрукаваная афсэтным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 4. Наклад 2000 асобнікаў.